ДУ «ВІЦЕБСКАЯ АБЛАСНАЯ БІБЛІЯТЭКА ІМЯ У.І.ЛЕНІНА»
АДДЗЕЛ БІБЛІЯТЭКАЗНАЎСТВА

# КУЛЬТУРНАЕ ЖЫЦЦЁ ВІЦЕБСКАЙ ВОБЛАСЦІ

Інфармацыйны веснік

МАЙ

Віцебск
2012

**КУЛЬТУРНАЕ ЖЫЦЦЁ ВІЦЕБСКАЙ ВОБЛАСЦІ**

**Май**

*Інфармацыйны веснік*

**2012 г.**

Складальнік *А. М. Васілеўская*
Рэдактар *В. М. Нявейкава*
Камп'ютарная вёрстка *А. В. Юпатава*
Адказны за выпуск *А. І. Сёмкін*

Надрукавана на ксераксе
ДУ "Віцебская абласная бібліятэка імя У. І. Леніна"
210601, Віцебск, Леніна, 8-а
E-mail: metodic@vlib.by, vlib@vlib.by



**КУЛЬТУРНАЕ ЖЫЦЦЁ ВІЦЕБСКАЙ ВОБЛАСЦІ**

**Май**

*Інфармацыйны веснік*

ВІЦЕБСК, 2012

УДК 008
ББК 71.41(4Беи–4Вит)
К 90

Складальнік А. М. Васілеўская
Рэдактар В. М. Нявейкава
Камп'ютарная вёрстка А. В. Юпатава
Адказны за выпуск А. І. Сёмкін

**Культурнае** жыццё Віцебскай вобласці : май : інфармацыйны веснік / ДУ "Віцебская абласная бібліятэка імя У. І. Леніна", Аддзел бібліятэказнаўства ; [склад. А. М. Васілеўская]. – Віцебск, 2012. – 64 с.

*Штомесячны інфармацыйны веснік разлічаны на сістэматычнае інфармаванне кіраўнікоў, супрацоўнікаў устаноў культуры і мастацтва горада і вобласці аб развіцці галіны культуры на Віцебшчыне.*

*Прызначаны для спецыялістаў інфармацыйных цэнтраў, культурна-асветных і музейных устаноў, краязнаўцаў, выкладчыкаў, студэнтаў і іншых катэгорыяў карыстальнікаў.*

© ДУ "Віцебская абласная бібліятэка імя У. І. Леніна", 2012 г.

гульнёвыя пляцоўкі. Адбыўся маладзёжны фотаконкурс "Жыві бясконца, Полацк непаўторны", прысвечаны юбілею горада, і канцэрт творчых калектываў гарадоў-пабрацімаў Полацка "Святочны горад, табе наш талент і любоў".

Урачыстыя мерапрыемствы прадоўжацца да 5 чэрвеня. У праграме свята – Фэст сярэднявечнай культуры "Рубон", мерапрыествы, прысвечаныя Дню памяці прападобнай Еўфрасінні Полацкай.

*Падрыхтавана па матэрыялах друку*

Літаратурна-музычная гасцёўня ”Назаўсёды з Полацкам” запрасіла прыхільнікаў мастацкага слова. Выступалі члены літаратурных аб’яднанняў Полацка і Наваполацка, а таксама члены Саюза пісьменнікаў Беларусі. Былі арганізаваны кніжныя тэматычныя выставы, прысвечаныя святу горада і Году кнігі.

Полацкая мастацкая галерэя ў дні святкавання юбілею запрасіла на выставу сучаснага беларускага мастацтва “Белорусские художники – Полоцку”. Самыя вядомыя сучасныя скульптары, графікі і жывапісцы краіны – Барыс Аракчэеў, Сяргей Цімохаў, Юрый Якавенка, Аляксандр Салаўёў, Сяргей Грыневіч – прадставілі свае лепшыя работы.

У рамках святочных мерапрыемстваў адбыліся праекты ДУ “Віцебскі АМЦНТ”: ”Крывіцкі кірмаш”, які здзівіў ўсіх наведвальнікаў разнастайнымі ўзорамі народнай творчасці, арганізацыя выступленняў творчых калектываў на падворках, а таксама абласное свята народных талентаў “Грай, гармонік!”, што прайшло на галоўнай сцэнічнай пляцоўцы г. Полацка 26 мая. У свяце прынялі ўдзел салісты, салісты-прыпевачнікі, салісты-гарманісты, ансамблі народных інструментаў, ансамблі народнай песні і музыкі. Пераможцы ў намінацыях: “Майстар прыпеўкі” – Людміла Барсукова з Гарадка і Аліна Бейтман з Лёзненскага раёна; “Гармонь – залатыя планачкі” – Іван Кастэнка з Лёзненскага раёна і Іван Курдзека з Докшыцкага раёна; “Лепшы ансамбль” – народны ансамбль гарманістаў Гарадоцкага РМЦ “Гарадоцкія музыкі” і народны ансамбль народнай музыкі “Баркавіцкія музыкі” Боркавіцкга СДК Верхнядзвінскага раёна; “Майстар інструментальнага жанру” – лепшы выканаўца на цымбалах Вольга Скорынава, вучаніца Шумілінскай ДШМ і баяніст Мікалай Вараб’ёў з Міёрскага раёна.

На час святкавання плошча Францыска Скарыны ператварылася ў дзіцяча-маладзёжную пляцоўку. Тут прайшоў дзіцячы творча-рамеслены кірмаш, працавалі атракцыёны,



# ЗМЕСТ

**ПРАДМОВА** ……4

**ХРОНІКА ПАДЗЕЙ**

Культурнае жыццё Віцебскай вобласці: інфармацыйнае паведамленне ……..5

**У ЦЭНТРЫ ЎВАГІ**

“Ад Полацка пачаўся свет…” : да 1150-годдзя з дня заснавання Полацка ..……60

# ПРАДМОВА

“Культурнае жыццё Віцебскай вобласці” – штомесячны інфармацыйны веснік, разлічаны на сістэматычнае інфармаванне кіраўнікоў, супрацоўнікаў устаноў культуры і мастацтва горада і вобласці аб развіцці галіны культуры на Віцебшчыне. Выданне можа быць карысным спецыялістам інфармацыйных цэнтраў, культурна-асветных і музейных устаноў, краязнаўцам, выкладчыкам, студэнтам і іншым катэгорыям карыстальнікаў.

Пастаянная рубрыка “Хроніка падзей” уключае тэкставыя вытрымкі і аналітычна перапрацаваную інфармацыю, падрыхтаваную на аснове публікацый з гарадскіх, раённых газет Віцебскай вобласці і іх электронных версій за перыяд з 1 па 31 мая 2012 года. “Хроніка падзей” таксама ўтрымлівае звесткі, атрыманыя з аддзела культуры Міёрскага райвыканкама, з аддзела культуры Талачынскага райвыканкама, Віцебскага АМЦНТ, Аршанскай, Бешанковіцкай, Браслаўскай, Верхнядзвінскай, Дубровенскай, Лепельскай, Лёзненскай, Пастаўскай, Полацкай, Сенненскай, Ушацкай і Шаркаўшчынскай раённых сетак бібліятэк, Віцебскай, Наваполацкай і Полацкай гарадскіх сетак бібліятэк.

Рубрыка “У цэнтры ўвагі” прысвечана святкаванню 1150-годдзя з дня заснавання г. Полацка.



“Харошкі”, заслужаная артыстка Беларусі Іна Афанасьева, Беларускі дзяржаўны ансамбль “Песняры”, вакальны ансамбль “Чысты голас”.

Сапраўдным святам песні і паэзіі стаў канцэрт “Золотая коллекция белорусской песни”. У ім удзельнічалі папулярныя выканаўцы і калектывы беларускай эстрады. Такі падарунак зрабіла рэспубліка гораду-юбіляру па ініцыятыве Міністэрства культуры.

Купцоў і карабейнікаў можна было сустрэць у “Купецкай гільдыі” на праспекце Францыска Скарыны. Тут размясціліся больш за дваццаць надворкаў, што прадстаўлялі розныя куткі Віцебшчыны.

У Музеі беларускага кнігадрукавання адбылася прэзентацыя кнігі «“Полоцк – Смоленск” : вехи общей судьбы», аўтарамі якой з’яўляюцца Навум Гальпяровіч і Наталля Ваніна. Кніга ўяўляе сабой даведнік па Полацку і Смаленску, расказвае пра гісторыю гарадоў і сучаснасць.

Павіншаваць горад з юбілеем прыехалі больш за тысячу гасцей, у тым ліку і дэлегацыі гарадоў-пабрацімаў з Расіі, Украіны, Польшчы. Былі падпісаны новыя дагаворы аб супрацоўніцтве з азербайджанскім горадам Мінгечэвір – буйным прамысловым цэнтрам Азербайджана і армянскім Алавердзі.

Цудоўны падарунак да юбілею роднага горада падрыхтаваў заслужаны аматарскі калектыў Беларусі – Полацкі тэатр “Пилигрим”. Гэта спектакль пра легендарную полацкую князёўну Рагнеду, прэм’ера якога адбылася 26 мая.

Парадаваў прыхільнікаў класікі канцэрт “Шедевры мирового искусства у стен древней Софии”, у гэты раз састаўлены з твораў савецкіх кампазітараў, а таксама канцэртная праграма “Еўропа Плюс Полацк”, у якой разам з таленавітымі спевакамі вобласці выступіў беларускі выканаўца Саша Нэма. У канцэртнай зале Сафійскага сабора прайшоў канцэрт арганнай музыкі.

## “АД ПОЛАЦКА ПАЧАЎСЯ СВЕТ…” : ДА 1150-ГОДДЗЯ З ДНЯ ЗАСНАВАННЯ Г. ПОЛАЦКА

Самы старажытны горад нашай краіны адзначыў свой юбілей. UNESCO ўключыла 1150-годдзе Полацка ў каляндар знамянальных і памятных дат 2012–2013 гадоў. У Парыжы, штаб-кватэры міжнароднай арганізацыі ў кастрычніку 2012 года пройдзе выстаўка, прысвечаная старажытнаму гораду.

24 мая ў Полацку быў урачыста адкрыты помнік дойліду Іаану, які па загадзе Еўфрасінні Полацкай у XII стагоддзі ўзвёў Спаса-Праабражэнскі храм. Твор Іаана называюць шэдэўрам старажытнарускай архітэктуры, што ўвасабляе вобраз нявесты Хрыстовай Еўфрасінні. Аўтарам помніка стаў скульптар Уладзімір Шапо, вучань Фелікса Гумена, ураджэнец Віцебскай вобласці.

Афіцыйнае адкрыццё мерапрыемстваў адбылося 25 мая, ва ўрачыстай цырымоніі адкрыцця свята прыняў удзел Прэзідэнт дзяржавы Аляксандр Лукашэнка. Для шматлікіх гасцей і гараджан быў арганізаваны святочны канцэрт ”Полацк мой, мая памяць і гонар…”, які распачаў шэраг мерапрыемстваў, прысвечаных юбілею. Канцэрт адбыўся 25 мая на плошчы Свабоды. Удзел у ім прынялі Беларускі дзяржаўны заслужаны харэаграфічны ансамбль





## КУЛЬТУРНАЕ ЖЫЦЦЁ ВІЦЕБСКАЙ ВОБЛАСЦІ

### КУЛЬТУРА

АГУЛЬНЫЯ ПЫТАННІ КУЛЬТУРЫ

**14 мая** прайшло пасяджэнне калегіі ўпраўлення культуры аблвыканкама, на якім адбылося ўручэнне прэмій Віцебскага абласнога выканаўчага камітэта за высокія дасягненні ў галіне культуры і мастацтва па выніках работы за 2011 год (згодна рашэння аблвыканкама ад 9 верасня 2004 г. № 563), Ганаровых грамат і іншых узнагарод.

Былі разгледжаны пытанні:

– аб выкананні асноўных паказчыкаў сацыяльна-эканамічнага развіцця галіны культуры за I квартал 2012 года;

– аб рабоце ўстаноў культуры за I квартал 2012 года, стане работы з сельскім гледачом і задачах па яе паляпшэнні;

– аб праблемных пытаннях у рабоце бібліятэк вобласці, правядзенні Года кнігі;

– аб выніках размеркавання выпускнікоў навучальных устаноў культуры і мастацтва;

– аб выніках дзіцячых конкурсаў і ўдзеле ў іх дзіцячых школ мастацтваў, аб прафесійнай арыентацыі навучэнцаў.

На пасяджэнні была звернута ўвага на падрыхтоўку да правядзення фестываляў “Дняпроўскія галасы ў Дуброўне”, “Браслаўскія зарніцы”, “Славянскі базар у Віцебску”, святкавання 1150-годдзя г. Полацка, Дня беларускай пісьменнасці ў г. Глыбокім і свята “Купалле ў Александрыі”.

**18 мая** адбылося пасяджэнне прэзідыума абласной

арганізацыі ветэранаў. З інфармацыяй аб выніках 11-га агляду-конкурсу калектываў мастацкай самадзейнасці ветэранскіх арганізацый нашай вобласці выступіла вядучы спецыяліст абласнога метадычнага цэнтра народнай творчасці *Таццяна Касачова*. Абласны агляд-конкурс адбыўся **20 красавіка** ў Паставах (удзельнічала каля 16 калектываў) і **21 красавіка** ў Дуброўна (каля 35 калектываў). Лаўрэатамі сталі ансамблі з Наваполацка, Полацка і Оршы, Пастаўскага і Дубровенскага раёнаў. А на рэспубліканскім аглядзе-конкурсе нашу вобласць прадстаўляў народны хор ветэранаў вайны і працы Наваполацка, а таксама выканаўцы з Шаркаўшчынскага раёна і Новалукомля.

*Народнае слова. – 2012. – 22 мая. – С. 2.*

**30 мая** на пасяджэнні абласнога выканаўчага камітэта сярод іншых пытанняў быў разгледжаны ход рэалізацыі мерапрыемстваў па правядзенні ў рэгіёне Года кнігі. Старшыня аблвыканкама *А. Косінец* прызнаў нездавальняючай матэрыяльна-тэхнічную базу бібліятэк у некаторых населеных пунктах і запатрабаваў ад мясцовых органаў улады разгледзець пытанні фінансавання рамонтных работ, вывучыць магчамасць аб'яднання школьных і публічных бібліятэк. На пасяджэнні аблвыканкама было таксама адзначана, што Віцебская вобласць праводзіць эксперымент па цэнтралізаванай закупцы друкаваных выданняў для публічных бібліятэк Прыдзвіння непасрэдна ў выдавецтве "Літаратура і Мастацтва". Па папярэдніх падліках, гэта дазволіць сэканоміць 35-40 працэнтаў бюджэтных сродкаў. Што датычыцца мерапрыемстваў да Году кнігі, то іх у нашым рэгіёне праводзіцца дастаткова. Па ўсёй Віцебшчыне прайшлі акцыі, прысвечаныя Тыдню дзіцячай і юнацкай кнігі, Дню праваслаўнай літаратуры, Міжнароднаму дню паэзіі. Ва ўстановах адукацыі і культуры выступаюць прыдзвінскія паэты і пісьменнікі, арганізуюцца прэзентацыі кніг, літаратурныя вечары, адкрытыя тэматычныя прагляды літаратуры, прэс-канферэнцыі з



Мерапрыемства праводзілася для ўдзельнікаў аматарскага краязнаўчага аб'яднання "Гарыслава".

**17 красавіка** ў бібліятэцы "Дабееўскі мох" з вучнямі 3 класа СШ № 2 адбылася гульня-падарожжа "Знаёмыя незнаёмцы" па творах *У. Акімушкіна*.

**29 красавіка** ў Слабадской сельскай бібліятэцы прайшла пазнавальная экалагічная віктарына "Птушыны базар". У мерапрыемстве прынялі ўдзел 19 вучняў 1–6 класаў, а таксама дзеці з небяспечных сем'яў.

свае ўласныя вершаваныя радкі.

**17 красавіка** Лужкаўская сельская бібліятэка разам са школьнай правялі “Велікодную сустрэчу”, на якую завіталі настаяцель прыхода царквы Святога Мікалая святар *Уладзімір* і благачынны айцец *Пётр.* На пачатку сустрэчы гучалі вершы, праслаўляючы светлы дзень Уваскрашэння Хрыстова, а пасля святары расказалі пра цудоўнае свята – Вялікдзень, яго традыцыі, звязаныя з гэтай падзеяй. Благачынны Пётр выказаў заклапочанасць тым, што сучасная моладзь надае перавагу камп’ютару, тэлебачанню і зусім не чытае праваслаўныя кнігі, якія вучаць дабру.

**20 красавіка** ў раённай бібліятэцы адбыўся вечар-сустрэча “Храни меня, мой иммунитет!”, на якую быў запрошаны ўрач-тэрапеўт *Аляксей Алегавіч Каралькоў.*

***Шумілінская раённая сетка публічных бібліятэк***

У Дабейскай сельскай бібліятэцы **4 красавіка** прайшло літаратурнае прадстаўленне да Міжнароднага дня дзіцячай кнігі “Книжное царство – премудрое государство”.

**8 красавіка** ў Светласельскай бібліятэцы адбылася літаратурная гульня "Знаўцы казак”. Яе ўдзельнікамі сталі 12 вучняў з 2-га па 4-ты клас. Мерапрыемства складалася з 4 тураў: "Казачная размінка", "Пазнай казку", "Казачная віктарына”, "Загадкавы конкурс".

Тэматычная сустрэча “Забыць немагчыма”, што прайшла ў чытальнай зале цэнтральнай раённай бібліятэкі **11 красавіка**, дала магчымасць сучасным дзецям адчуць перажытае іх равеснікамі ў далёкія гады. Расказаць праўду пра фашызм дзевяцікласнікам СШ № 1 прыйшлі шэсць былых вязняў фашысцкіх лагераў.

**15 красавіка** ў Мішнявіцкай сельскай бібліятэцы была праведзена гадзіна пасхальных гульняў “Пасхальны благавест”.



удзелам членаў Саюза пісьменнікаў Беларусі і інш.

*Віцебскі рабочы. – 2012. – 2 чэрв. – С. 2.*

Урачыста адзначыла Віцебская вобласць **67-ю гадавіну Вялікай Перамогі.** Установы культуры прынялі актыўны ўдзел у падрыхтоўцы і святкаванні Дня Перамогі. Паўсюдна праходзілі мітынгі, урачыстыя сходы грамадскасці, сустрэчы з ветэранамі, канцэрты.

**9 мая** ў Віцебску адбылося ўрачыстае святкаванне Дня Перамогі на аднайменнай плошчы. Кіраўніцтва вобласці, горада, ветэраны, прадстаўнікі грамадства ўсклалі кветкі да манумента ў гонар савецкіх воінаў-вызваліцеляў, партызан і падпольшчыкаў вобласці, пасля гэтага ўсіх землякоў павіншаваў са святам старшыня Віцебскага аблвыканкама *Аляксандр Косінец.* Працягам ўрачыстага мітынгу стаў ваенны парад. Пасля яго адбылася яшчэ адна значная падзея: ветэраны на чале з губернатарам пасадзілі маладыя дубкі ў парку Пераможцаў. Увесь дзень ў горадзе працягваліся ўрачыстасці. Канцэрты і забаўляльныя праграмы адбыліся на плошчах Перамогі і Свабоды, у парку Пераможцаў, на вуліцах Суворава і Пушкіна. Увечары на плошчы Перамогі пачаўся святочны канцэрт.

У ліку мерапрыемстваў, прысвечаных Дню Перамогі на Браслаўшчыне, стаў паказ спектакля “Рядовые” па п’есе *Аляксея Дударава* ў пастаноўцы рэжысёра народнага тэатра раённага Дома культуры *Яўгена Набеева.*

*Народнае слова. – 2012. – 11 мая. – С. 10.*

У Докшыцкім раёне да свята Перамогі была прымеркавана серыя грамадска-культурных мерапрыемстваў. Пачаліся ўрачыстасці ўскладаннем кветак і вянкоў да помнікаў у райцэнтры і на мемарыяльным комплексе “Шунёўка”. У Бягомльскім музеі народнай славы франтавікі і партызаны Вялікай Айчыннай наведалі

выставу ваеннага плаката, прынялі ўдзел у тэатралізаванай экскурсіі. Тут жа адбыўся і канцэрт мастацкай самадзейнасці “На привале”.

Агляд-конкурс патрыятычнай песні “Победные марши” ў Наваполацку прысвяцілі 67-й гадавіне Вялікай Перамогі. Арганізатарам мерапрыемства выступіла гарадская арганізацыя ГА “Белая Русь” пад кіраўніцтвам вядомага спартсмена *Вадзіма Дзевятоўскага.*

**9 мая** свята Вялікай Перамогі адзначалі Міёры. Да абеліску ў гонар вайсковых часцей, якія вызвалялі раённы цэнтр, былі ўскладзены вянкі, гірлянды, жывыя кветкі. Затым месцам урачыстасці стала плошча Загінуўшых барацьбітоў, дзе адбыўся мітынг-рэквіем. На ім ушанавалі подзіг народа-героя, воінаў, партызан і падпольшчыкаў, працаўнікоў тылу. Прывітанне ветэранам падрыхтавалі юныя піянеры.

*Аддзел культуры Міёрскага райвыканкама*

З вечара **8 мая** да раніцы **9 мая** на алеі Герояў Сянно неслі ганаровую варту ўдзельнікі ваенна-патрыятычнага клуба “Спарта”. А пачалося свята ў Сянно з мітынгу з удзелам ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны. Самадзейныя артысты падрыхтавалі канцэртную праграму. У ходзе акцыі “Спасибо за Победу!” актывісты маладзёжнага руху ўручылі жадаючым георгіеўскія стужкі. Спартсмены адзначылі свята традыцыйным велапрабегам Сянно – Ульянавічы.

Урачыстым шэсцем па вуліцах г. п. Ушачы прайшлі прадстаўнікі працоўных калектываў, грамадскіх арганізацый, спартсмены. Пасля ўскладання кветак да помніка загінуўшым воінам і партызанам адбыўся мітынг-рэквіем на мемарыяльным комплексе “Прарыў”. Дапоўнілі святочную праграму тэатралізаванае прадстаўленне і вялікі канцэрт мастацкай самадзейнасці ў райцэнтры.



Падчас семінара бібліятэкар Пашкоўскай сельскай бібліятэкі, якая працуе па мэтавай праграме “Шлях да духоўнасці”, правяла гадзіну духоўнасці “І лік святы нам душу грэе”, прымеркаваны да Дня праваслаўнай кнігі. Бібліятэкары прынялі ўдзел у анкетаванні “Вывучэнне чытання беларускай літаратуры”, а таксама падвялі вынікі работы творчай лабараторыі “Жыве Максімава імя”. Пасля кароткай паўзы адбылася сустрэча з пісьменнікам, земляком *В. А. Праўдзін*ым. На працягу вечара пісьменнік адказваў на пытанні, дзяліўся планамі на будучыню, а на памяць аб сустрэчы *Віктар Аляксандравіч* падарыў чытачам свае кнігі з аўтографам.

У Сталіцкай сельскай бібліятэцы адбылася прэзентацыя кніжнай выставы “Кніга крочыць па планеце”, з якой чытачы даведаліся пра кнігі-юбіляры года, пазнаёміліся з кніжнымі навінкамі.

Падчас бацькоўскай гадзіны ў Жукоўшчынскай сельскай бібліятэцы бібліятэкар пазнаёміла чытачоў з любімымі кнігамі дзяцей.

У Ручайскай сельскай бібліятэцы адкрыўся бібліярэстаран “Беларусачка”, у якім на халодныя закускі падаюцца казкі, апавяданні для дзяцей, гарачыя стравы – дэтэктывы, фантастыка, можна пакаштаваць і нацыянальную кухню – літаратуру беларускіх пісьменнікаў. Жадаючым прапануецца і дэсерт – вершы рознай тэматыкі.

**2 красавіка** ўзяў старт чытацкі бібліямарафон “Землякі чытаюць творы Я. Купалы і Я. Коласа”, які прадоўжыцца да **1 кастрычніка** і пройдзе ў бібліятэках сямі сельскіх Саветаў Шаркаўшчынскага раёна.

**3 красавіка** маленькія чытачы Вялікасельскай бібліятэкі адправіліся “У госці да Я. Купалы і Я. Коласа”. Падчас вечара-падарожжа юныя чытачы пазнаёміліся з кароткай біяграфіяй пісьменнікаў, паслухалі творы для дзяцей, а некаторыя зачыталі

### *Ушацкая раённая сетка публічных бібліятэк*

Весела і пазнавальна прайшоў у Арэхаўскай сельскай бібліятэцы Дзень дашкольніка “Стань чытачом, дружок”. Гасцямі ўстановы культуры сталі выхаванцы сярэдняй і старэйшай груп дзіцячага сада. Дзецям была прапанавана экскурсія па цудоўным доме – бібліятэцы і гутарка-гульня “Як трэба сябе весці ў бібліятэцы”. На памяць аб сустрэчы выхаванцы дзіцячага сада атрымалі салодкія прызы і кнігі ў падарунак.

*Патрыёт (Ушачы). – 2012. – 21 крас. – С. 9.*

**17 красавіка** ў Іллюшанскай сельскай бібліятэцы прайшло пасяджэнне жаночага клуба “Лада” пад назвай “Воскресенье Христово”.

На вечар-сустрэчу з клубам нацыянальных культур “Дружба” запрасіла сваіх чытачоў ЦРБ імя Е. Лось **20 красавіка.**

**21 красавіка** чытачы дзіцячай бібліятэкі адправіліся ў літаратурны круіз “Путешествие в страну ее Величества Книги”.

**26 красавіка** гутарка-калаж “На зямлі былінных продкаў” прайшла ў Вялікадолецкай сельскай бібліятэцы.

### *Чашніцкая раённая сетка публічных бібліятэк*

**16 красавіка** ў горадзе энэргетыкаў адбылася сустрэча з членам Саюза пісьменнікаў Беларусі *Верай Аляксандраўнай Буланда*. У Новалукомльскай гарадской бібліятэцы паэтэсу сустракалі мясцовыя пісьменнікі, ліцэісты і аматары паэзіі.

### *Шаркаўшчынская раённая сетка публічных бібліятэк*

**2 красавіка** на базе раённай бібліятэкі прайшоў тэматычны семінар “Чытаць – значыць думаць”. У пачатку семінара бібліятэчныя работнікі акцэнтавалі ўвагу на асноўных формах папулярызацыі беларускай літаратуры. Цікавым атрымаўся і агляд новых паступленняў літаратуры “Добры дзень, кніжка беларуская”.



**9 мая** творчымі работнікамі Талачынскага гарадскога Дома культуры праведзена культурна-дасугавая праграма “Наша слава і памяць” з удзелам калектываў аматарскай творчасці і асобных выканаўцаў Коханаўскай ДШМ, таксама працавала выстава дэкаратыўна-прыкладнога і выяўленчага мастацтва “Са святам Перамогі!” раённага Дома рамёстваў. Канцэрты, віншаванні ветэранаў вайны на даму, мітынгі-рэквіемы, літаратурна-музычныя кампазіцыі прайшлі ва ўсіх установах культуры раёна.

Святочная калона прайшла па цэнтры Чашнікаў да помніка воінам-вызваліцелям і алеі Герояў Савецкага Саюза. На ганаровым мітынгу старшыня райвыканкама *Уладзімір Булай* павіншаваў усіх з Днём Перамогі. Затым ён сустрэўся з ветэранамі Вялікай Айчыннай вайны. Адбылася легкаатлетычная эстафета, у якой прынялі ўдзел працоўныя калектывы і школьнікі. Завяршылася свята канцэртам.

*Витьбичи=Віцьбічы. – 2012. – 11 мая. – С. 4.*

*Віцебскі рабочы. – 2012. – 11 мая. – С. 1–2.*

*Народнае слова. – 2012. – 11 мая. – С. 1, 8.*

*Аддзел культуры Міёрскага райвыканкама*

*Аддзел культуры Талачынскага райвыканкама*

**13 мая** адзначаўся **Дзень Дзяржаўнага Герба і Дзяржаўнага Сцяга Рэспублікі Беларусь**. У Віцебску ўрачыстая цырымонія прайшла на праспекце Перамогі (каля помніка “Ордэн Перамогі”). Сюды па Маскоўскім праспекце Дзяржаўны Сцяг і факел, запалены ад Вечнага агню ля манумента воінам-вызваліцелям, даставілі лепшыя спартсмены вобласці. Ад імя ўлады прысутных павіншаваў са святам старшыня Віцебскага гарадскога Савета дэпутатаў *Мікалай Смунёў*. Права ўзняць Дзяржаўны Сцяг было прадастаўлена лаўрэату ганаровага звання “Чалавек года Віцебшчыны-2012”, камандзіру асобнага аэрамабільнага батальёна *Дзмітрыю Коршунаву*, удзельніцы Вялікай Айчыннай вайны *Таццяне Забела*, стыпендыяту

спецыяльнага фонду Прэзідэнта па падтрымцы адоранай моладзі, студэнтцы трэцяга курса ВДУ імя П. М. Машэрава *Анастасіі Івановай*.

*Народнае слова. – 2012. – 15 мая. – С. 1.*

Мерапрыемствы, прысвечаныя гэтаму святу, адбыліся ва ўсіх раёнах вобласці. Ва ўстановах культуры Міёрскага раёна прайшлі клубныя гутаркі, вечары пытанняў і адказаў, пазнавальныя гадзіны, віктарыны. У бібліятэках сістэмы афармлены тэматычныя кніжныя выставы.

*Аддзел культуры Міёрскага райвыканкама*

Работнікі клубных устаноў Талачынскага раёна да Дня Дзяржаўнага Герба і Дзяржаўнага Сцяга Рэспублікі Беларусь падрыхтавалі і правялі наступныя мерапрыемствы: тэматычны вечар “Сімволіка маёй краіны” (Рамашкаўскі клуб-бібліятэка), “Наш Герб і Сцяг – гэта сімвалы свабоды” (Валосаўскі сельскі клуб), канцэрт “Сімволіка нашай Радзімы” (Серкавіцкі СДК), лекцыю-канцэрт “Дзяржаўны Герб і Сцяг Рэспублікі Беларусь” (Славенскі сельскі клуб), кіналекцыю “История Герба и Флага Республики Беларусь” (Талачынскі ГДК) і інш.

*Аддзел культуры Талачынскага райвыканкама*

**Міжнародны дзень сям’і** адзначаўся **15 мая.** Ва ўстановах культуры Міёрскага раёна праведзены шэраг мерапрыемстваў. У клубных установах – вечары сямейнага адпачынку, конкурсна-гульнёвыя праграмы, сямейныя святы, клубныя вячоркі, клубныя агеньчыкі. У бібліятэках Міёрскай ЦБС былі арганізаваны агляды літаратуры, тэматычныя кніжныя паліцы, конкурсныя праграмы, сямейныя тэматычныя вечары “Святло сям’і”, “Усё пачынаецца з сям’і” і інш.

Напярэдадні Міжнароднага дня сям’і ў Полацкім раённым Доме культуры прайшоў гарадскі агляд-конкурс “Лучшая



***Сенненская раённая сетка публічных бібліятэк***

2012 год – Год кнігі, таму невыпадкова асаблівая ўвага ў бібліятэках Сенненскай ЦБС удзяляецца прапагандзе беларускай літаратуры. Аддзелам маркетынгу ў дапамогу бібліятэкару выдадзены метадычны дапаможнік “Кніга – невычэрпная крыніца мудрасці”, прэзентацыя якога адбылася на чарговым семінары.

**18 красавіка** на сцэне Сенненскага Дома культуры было праведзена літаратурнае свята “Яе Вялікасць Кніга”. Жыхары раённага цэнтра мелі магчымасць наведаць выставу “Цацкі майго дзяцінства”, выставу малюнкаў “Мой любімы казачны герой”. Былі афармлены кніжныя выставы, дзе экспанаваліся рэтра-кнігі і літаратура сённяшніх дзён. Гасцей свята сустракалі з рэкламнымі буклетамі казачныя персанажы Каралева Кніга, Мальвіна, Нязнайка, роставыя лялькі Клоўна і Мядзведзя. На свята былі запрошаны лепшыя чытачы раённай і дзіцячай бібліятэк. Мерапрыемства суправаждалася паказам слайд-фільма, відэакліпамі. У свяце ўдзельнічалі РДК, ДШМ, школы горада, школа-інтэрнат.

З **1** па **30 красавіка** ў бібліятэках сістэмы была аб’яўлена акцыя “Падары бібліятэцы кнігу”. Таксама ў гэты час супрацоўнікі раённай бібліятэкі пабывалі ў арганізацыях і ўстановах горада з мэтай папулярызацыі лепшых твораў айчыннай і замежнай літаратуры, бібліятэчных паслуг.

Сенненская ЦРБ з дабраахвотнай акцыяй наведала аддзяленне дзённага знаходжання інвалідаў, дзе правяла агляд беларускіх выданняў “Пра Беларусь і беларусаў” і падарыла невялікую бібліятэку наведвальнікам гэтага цэнтра.

У **красавіку** бібліятэкі прынялі актыўны ўдзел у рэспубліканскай прафілактычнай акцыі “Дом без насилия”. Былі арганізаваны выставы-прагляды літаратуры, гадзіны папярэджання, урокі здароўя, наведаны сацыяльна небяспечныя сем’і.

Дзіцячая бібліятэка імя У. Дубоўкі Тыдзень дзіцячай кнігі адкрыла “Незвычайнымі прыгодамі Каралевы Кнігі і Камп’ютара Компі”. Адкрыццё Тыдня адбылося на сцэне раённага Дома культуры, прысутнічалі вучні СШ № 1. Вучні СШ № 2, 3, 4 прынялі ўдзел у гульні-падарожжы “Книга – это друг человека”, у літаратурнай гульні «“Вясёлцы” – 55», лялечным прадстаўленні ”Путешествие по чудо-сказкам”, прысвечаным 130-годдзю з дня нараджэння К. Чукоўскага; у чытальнай зале дзіцячай бібліятэкі быў арганізаваны адкрыты прагляд літаратуры “Сыны зямлі беларускай” да 130-годдзя з дня нараджэння Я. Коласа і Я. Купалы, 100-годдзя з дня нараджэння М. Танка.

**Полацкая раённая сетка публічных бібліятэк**

Да Міжнароднага дня дзіцячай кнігі Полацкая ЦРБ **1 красавіка** правяла для вучняў СШ № 3 г. Полацка віктарыну “Книжное царство – премудрое государство”. На мерапрыемства былі запрошаны члены літаратурнага аб’яднання “Наддзвінне”.

**7 красавіка** ў Фарынаўскай бібліятэцы адбыўся брэйн-рынг, да якога падрыхтавалі выставу-заклік “Мы – за здоровый образ жизни” (Да Сусветнага дня здароўя), на мерапрыемства была запрошана загадчыца Фарынаўскай амбулаторыі.

Сумесна з Полацкай епархіяй Багушэўская сельская бібліятэка **15 красавіка** правяла лялечнае прадстаўленне для вучняў малодшых класаў “Радуйтесь все люди, Христос Воскрес!”.

**26 красавіка** ў Гаранскай сельскай бібліятэцы прайшоў вечар-рэквіем “Чарнобыль – палын горкі”. На мерапрыемства былі запрошаны эколагі раёна.

**28 красавіка** Ветрынская гарпасялковая бібліятэка сумесна з прадстаўнікамі прыродаахоўчай арганізацыяй раёна падрыхтавала і правяла вечарыну “Званамі памяці звоніць Чарнобыль”.



многодетная семья”. Павышэнне прэстыжу і аўтарытэту шматдзетнай сям’і стала адной з галоўных мэт мерапрыемства, у якім прынялі ўдзел 10 сямей.

*Полацкі веснік. – 2012. – 15 мая. – С. 5.*

**13 мая** ў Цэнтры культуры Глыбокага праходзіла мерапрыемства, якое стала ўжо традыцыйным, “На дваіх адзін дзень нараджэння”. На свяце прысутнічалі пятнаццаць пар блізнят і двайнят, ад малышоў да дарослых людзей. У ролі арганізатара выступіў аддзел культуры Глыбоцкага райвыканкама.

*Веснік Глыбоччыны.2012 – 19 мая. – С. 1–2.*

Творчымі работнікамі клубных устаноў Талачынскага раёна былі падрыхтаваны і праведзены: вечар адпачынку “Папа, мама и я – дружная семья” (Маціеўскі клуб-бібліятэка, Друцкі сельскі клуб), канцэрт “Счастливый тот, кто счастлив дома” (Дзімітраўскі СДК), конкурс малюнкаў “Моя семья” (Звяняцкі СДК) і г. д.

**26–27 мая** ў Віцебску прайшоў фестываль сямейнай творчасці “Талантливы вместе”, арганізаваны Віцебскім грамадскім аб’яднаннем “Городское еврейское общество” і Цэнтрам нацыянальных культур. Два дні таленавітыя сем’і розных гарадоў (удзельнікі прадстаўлялі Віцебск, Магілёў, Гомель, Бабруйск, Ліду і Пінск) і розных нацыянальнасцей (яўрэі, цыгане, беларусы, грэкі, латышы) радавалі гледачоў не толькі сваёй творчасцю, але і непаўторнай атмасферай падтрымкі, цяпла і любові. Пра гэта гаварыла і старшыня журы – вядомы харэограф, педагог і танцаўшчыца *Іна Асламава*, калі ўручала Гран-пры фестывалю мінскай групе “Лехаим”.

*Витебский проспект. – 2012. – 31 мая. – С. 2.*

КУЛЬТУРНА-АСВЕТНАЯ РАБОТА.
САЦЫЯКУЛЬТУРНАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ У СФЕРЫ ВОЛЬНАГА ЧАСУ

*КУЛЬТУРНЫЯ СУВЯЗІ*

У Мастацкай галерэі Полацка адбылося адкрыццё фотавыставы “Злата Прага”, якую складаюць фотаздымкі, прадстаўленыя супрацоўнікамі пасольства Чэхіі ў Рэспубліцы Беларусь.

*Полацкі веснік. – 2012. – 2 мая. – С. 4.*

Вядомая прыдзвінская паэтэса, старшыня Віцебскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі *Тамара Краснова-Гусачэнка* стала ўладальніцай прэстыжнай творчай узнагароды. У рамках чытанняў “Прохоровское поле”, якія раз у два гады праводзяцца ў Расіі ў памяць аб гераічнай танкавай бітве пад Прохараўкай, проходзіць і конкурс на лепшы твор патрыятычнай тэматыкі. З 2010 года ўзнагарода літаратурная прэмія “Прохоровское поле” стала міжнароднай.

*Народнае слова. – 2012. – 5 мая. – С. 2.*

*Віцебскі рабочы. – 2012. – 3 мая. – С. 2.*

**13 мая** ў выставачнай зале музея сучаснага мастацтва расійскі кінарэжысёр *Аляксандар Навумавіч Міта* сабраў журналістаў Віцебска, каб падзяліцца сваімі планамі пра фільм з рабочай назвай “Миракль о Шагале”, у аснову якога пакладзены канфлікт паміж двумя мастакамі – *Маркам Шагалам* і *Казімірам Малевічам.*

*Витебский проспект. – 2012. – 17 мая. – С. 23.*

*Народнае слова. – 2012. – 22 мая. – С. 8.*

*КЛУБНАЯ СПРАВА*

**1 мая** адбыўся раённы конкурс культарганізатараў “Гульнёвыя забавы-2012” з удзелам творчых калектываў клубных



дня нараджэння К. Чукоўскага, а **12 красавіка** школьнікаў запрасілі на тэатралізаванае свята “Путешествие в страну Её Величества Книги”.

У сельскай бібліятэцы аграгарадка Дабрынь **21 красавіка** для вучняў сярэдняга і старэйшага школьнага ўзросту Дабрынскай СШ адбыўся літаратурны вечар, прымеркаваны да 130-годдзя з дня нараджэння Я. Купалы “Усё мне тут блізка, знаёма”.

***Лёзненская раённая сетка публічных бібліятэк***

З **9 па 16 красавіка** ў раённай дзіцячай бібліятэцы прайшоў Тыдзень дзіцячай і юнацкай кнігі.

**11 красавіка** да Міжнароднага дня вызвалення вязняў фашысцкіх канцлагераў Чкалаўская гарпасялковая бібліятэка запрасіла чытачоў на вечар-рэквіем “Споведзь жывых”.

**26 красавіка** ў цэнтральнай раённай бібліятэцы адбыўся ўрок праўды “Полымя Чарнобыля”.

***Міёрская раённая сетка публічных бібліятэк***

**17 красавіка** ў цэнтральнай раённай бібліятэцы адбылася сустрэча чытачоў з членамі літартурна-музычнага аб’яднання “Світанак” Шаркаўшчынскага РДК *Віктарам Лагуном, Надзеяй Паляк, Міледзіем Кукуцем* і *Таццянай Еўдаковай* на чале з кіраўніком аб’яднання, вядомай у раёне і за яго межамі паэткай, членам Саюза пісьменнікаў Беларусі, членам Саюза журналістаў краіны *Кацярынай Сосна*.

***Пастаўская раённая сетка публічных бібліятэк***

На базе Пастаўскай цэнтральнай раённай бібліятэкі адбыўся семінар школьных бібліятэкараў **25 красавіка,** а **27 красавіка** прайшоў абмен вопытам работы бібліятэк Пастаўскай ЦБС “Платные услуги: коммерческий абонемент”.

аддзела прафілактыкі СНІДу Віцебскага абласнога цэнтра гігіены і эпідэміялогіі *В. П. Якаўлева* расказала падлеткам аб праблеме СНІДу.

**26 красавіка** ў Курынскай сельскай бібліятэцы прайшла чытацкая канферэнцыя для падлеткаў і моладзі “Чарнобыль: чорны боль, чорная быль”. Для абмеркавання ўдзельнікам канферэнцыі былі прапанаваны творы І. Шамякіна “Злая зорка”, С. Алексіевіч “Чарнобыльская малітва”.

***Гарадоцкая раённая сетка публічных бібліятэк***

**17 красавіка** па запрашэнні цэнтральнай раённай бібліятэкі Гарадок наведаў малады беларускі паэт *Рагнед Малахоўскі*. Літаратурную гасціную “Квецень беларускага слова” дапамаглі наладзіць літаратурны клуб “Гарадзянка”, які створаны пры Гарадоцкай цэнтральнай бібліятэцы, і дзіцячая школа мастацтваў. На сустрэчы паэт расказаў пра сябе, пачытаў свае вершы, а таксама зрабіў прэзентацыю свайго фотаальбома.

**19 красавіка** супрацоўнікі Гарадоцкай ЦБС у рамках Года кнігі правялі дзень інфармавання, які прайшоў у ААТ “Гарадоцкі РАПС”. Бібліятэкары расказалі пра бібліятэчныя фонды, новыя паступленні кніг, прадэманстравалі перыядычныя выданні, пазнаёмілі з работай існуючага пры бібліятэцы цэнтра прававой інфармацыі, раздалі прысутным буклеты.

***Дубровенская раённая сетка публічных бібліятэк***

У **красавіку** ўсе бібліятэкі раёна прымалі ўдзел у фотаконкурсе “Прекрасен мир живой природы”, які праводзіўся ў рамках мэтавай комплекснай праграмы “Захаваем прыгажосць і здароўе роднай зямлі”.

**6 красавіка** ў дзіцячай бібліятэцы прайшоў ранішнік для чытачоў малодшага школьнага ўзросту, прысвечаны 130-годдзю з



установ Талачынскага раёна.

У Глыбоцкім раёне на базе Гатаўшчынскага сельскага Дома культуры прайшоў тэматычны семінар “Актывізацыя работы ўстаноў культуры з працаўнікамі сельскай гаспадаркі ў кантэксце сучасных патрабаванняў”, на які быў запрошаны старшыня Пліскага сельскага выканкама *В. М. Пліско*.

*Веснік Глыбоччыны. – 2012. – 8 мая. – С. 7.*

**10 мая** ў Міёрскім РДК быў праведзены раённы конкурс прафесійнага майстэрства культарганізатараў, на якім свае лепшыя гульнёвыя праграмы прадстаўлялі клубныя работнікі раёна. Самай цікавай і відовішчнай прызнана сюжэтна-гульнёвая праграма “Дзеўка замуж захацела” Туркоўскага сельскага Дома культуры, якая атрымала першае месца сярод праграм клубных установ. Другое месца было прысуджана Нікалаёўскаму сельскаму клубу за гульнёва-забаўляльную праграму “У гасцях у казкі”.

*Аддзел культуры Міёрскага райвыканкама*

У Мазалаўскім СДК прайшоў семінар-практыкум для настаўнікаў харэаграфічных дысцыплін ДШМ і кіраўнікоў харэаграфічных установ культуры Віцебскага раёна. На ім разгледжаны пытанні арганізацыі работы харэаграфічнага аддзялення дзяржаўных установ дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі ў сферы культуры.

*Жыццё Прыдзвіння (Віцебск). – 2012. – 12 мая. – С. 5.*

**12 мая** ў Дубровенскім раённым Доме культуры адбыўся творчы фестываль “Парад созвездий”. Конкурс юных талентаў падрыхтаваны супрацоўнікамі раённага арганізацыйна-метадычнага цэнтра аддзела культуры райвыканкама.

*Дняпроўская праўда (Дуброўна). – 2012. – 19 мая. – С. 3.*

**14–19 мая** ў Віцебскім абласным цэнтры павышэння кваліфікацыі кіруючых работнікаў і спецыялістаў установ культуры

прайшлі абласныя курсы для дырэктараў СДК аграгарадкоў.

*Віцебскі АМЦНТ*

**24 мая** ў раённым Доме культуры змагацца за званне “Супер-бабушка-2012” сабраліся самыя актыўныя, вясёлыя і пазітыўныя бабулі Дубровеншчыны.

*Дняпроўская праўда (Дуброўна). – 2012. – 26 мая. – С. 1.*

Студыя эстраднага майстэрства “Тандэм” адзначыла дзесяцігоддзе. Больш за трыста чалавек прыйшлі павіншаваць калектыў Полацкага раённага Дома культуры.

*Полацкі веснік. – 2012. – 8 мая. – С. 7.*

*ФЕСТЫВАЛІ, СВЯТЫ, КОНКУРСЫ*

З **2** па **5 мая** ў Віцебскай акадэміі ветэрынарнай медыцыны прайшоў сёмы рэспубліканскі фестываль калектываў сярэдніх спецыяльных устаноў адукацыі аграрнага профілю “Студенческая весна-2012”.

*Віцебскі рабочы. – 2012. – 8 мая. – С. 8.*

У Мінску **7–8 мая** адбыўся XI Рэспубліканскі фестываль народнай творчасці ветэранскіх калектываў “Не старэюць душой ветэраны!”. Віцебскую вобласць на ім прадставілі *Уладзімір Баярын* з Новалукомля (лаўрэат III ступені), *Мікалай Марозаў* з Шаркаўшчыны (лаўрэат I ступені) і народны хор ветэранаў вайны і працы Палаца культуры г. Наваполацка (лаўрэат III ступені).

*Віцебскі АМЦНТ*

У рамках Нацыянальнай праграмы дэмаграфічнай небяспекі Рэспублікі Беларусь на 2011–2012 гады быў арганізаваны конкурс “Лучшая многодетная семья Витебщины-2012”, які ў вобласці праводзіцца ўпершыню. Пераможцы кожнага з трох рэгіянальных этапаў конкурсу-агляду, якія адбыліся ў Наваполацку, Оршы і аграгарадку Ноўка, сустрэліся ў фінале **18 мая** ў культурна-



**25 красавіка** ў цэнтральнай раённай бібліятэцы была прадстаўлена мультымедыйная прэзентацыя “Под Чернобыльским пеплом”.

**27 красавіка** ў ЦРБ праведзена гадзіна паэзіі, прысвечаная памяці паэта-земляка Э. Зубрыцкага “Мне вялікае права далі быць паэтам і неба, і людзі”. Гэтаму пісьменніку прысвяцілі мерапрыемствы супрацоўнікі Боркавіцкай сельскай бібліятэкі “И мне не разлюбить Отчизну в трепетных ладонях”, Сакалоўшчынскай – “Роднае зямлі ўдзячны сын”, Каханавіцкай – “Упала в озеро слеза”, Сенькаўскай – “Вернасць вытокам”.

***Віцебская раённая сетка публічных бібліятэк***

**5 красавіка** на базе Бабініцкай сельскай бібліятэкі праведзены Дзень здароўя “Здароўе – гэта здорава!” з удзелам псіхолага Віцебскага цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя *В. П. Якаўлевай*. Тэмай размовы стала праблема захворвання на СНІД. Загадчыца аддзела бібліятэчнага маркетынгу Віцебскай РЦБС *Т. П. Прудзікава* расказала якое адлюстраванне гэта тэма знайшла ў творах мастацкай літаратуры.

**15 красавіка** супрацоўнікі Мазалаўскай сельскай бібліятэкі сумесна з ДК праводзілі “Велікодны карагод у вёсцы Мазалава”, падчас якога спявалі абрадавыя песні, праводзілі велікодныя гульні, прадставілі выставу велікодных страў.

**17 красавіка** ў Кіраўскай сельскай бібліятэцы адбылася прэзентацыя чарговай выставы вядомага мастака Віцебшчыны, члена Беларускага саюза мастакоў *У. І. Вітко* “Падарожжа ў часе”. У бібліятэцы экспануецца 13 работ мастака, кожная з якіх адметна: “1941 год”, “Пераправа”, “Апошні снег”, “Доктар”, “Кветкі для дзяўчат”, “Беларускі матыў” і інш.

**19 красавіка** ў Акцябрскай сельскай бібліятэцы праведзены кіналекторый “Я выбіраю шлях, дзе СНІДу – няма!”. Псіхолаг

каляндар “Зялёная аптэка на службе ў чалавека”. У сустрэчы прыняла ўдзел урач-дэрмавенеролаг Браслаўскай цэнтральнай бальніцы *К. С. Філімонава*.

**18 красавіка** ў цэнтральнай бібліятэцы была праведзена нарада бібліятэчных работнікаў, на якую быў запрошаны начальнік аддзела правапарадку і прафілактыкі Браслаўскага РАУС *А. А. Смірнова* і дырэктар Браслаўскага музея традыцыйнай культуры *Э. У. Зінкевіч.*

**26 красавіка** ў Відзаўскай дзіцячай бібліятэцы адбыўся Дзень дашкольніка, на працягу якога прайшлі наступныя мерапрыемствы: кніжная выстава “Научусь-ка я читать”, экскурсія па бібліятэцы “Дом, дзе жывуць кнігі”, гучнае чытанне “Расскажу-ка я, ребята, вам…”, казачны турнір “На сказочных тропинках”.

Тыдзень абітурыента прайшоў у Далёкаўскай бібліятэцы з **25 красавіка** па **29 красавіка**. Падлеткам быў прапанаваны тэматычны агляд газеты “Раніца”, тэст “Примеряем профессию на себя”, інфармацыйны спіс літаратуры “Для цябе, абітурыент”, а таксама афармлены куток абітурыента “Увага! Новыя прафесіі!”.

**26 красавіка** адбыўся Дзень дзіцячай бібліятэкі “Веселые приключения в детской библиотеке”, які ўключыў наступныя мерапрыемствы: экскурсію па бібліятэцы з Каралевай Кнігай, мультымедыйную прэзентацыю новых беларускіх кніг “Казачнае царства дзіцячых кніг”, а таксама кансультацыю псіхолага “Детские фантазии”.

***Верхнядзвінская раённая сетка публічных бібліятэк***

**10 красавіка** ў Верхнядзвінскай ЦРБ адбылася гадзіна памяці “Сердца, помнящие войну”, прысвечаная вызваленню вязняў фашысцкіх канцлагераў.

**19 красавіка** ў ЦРБ прайшла сустрэча з пісьменнікам “Літаратурная скарбонка *Ю. Татарынава*”.



спартыўным цэнтры Віцебскага аддзялення Беларускай чыгункі. Восем шматдзетных сем’яў з розных куткоў вобласці змагаліся за права называцца лепшай. Яны прадэманстравалі, на што прыдатная дружная вялікая сям’я. Значная падтрымка залы, цудоўна падрыхтаваныя нумары, адкрытасць і ўпэўненасць у правільнасці самага галоўнага ў жыцці рашэння дапамаглі сям’і *Святланы* і *Міхаіла Кліменцьевых* з Полацка стаць лепшай шматдзетнай сям’ёй Віцебшчыны 2012 года.

*Витьбичи=Віцьбічы. – 2012. – 19 мая. – С. 1–2.*

*Витьбичи=Віцьбічы. – 2012. – 22 мая. – С. 1, 3.*

*Народнае слова. – 2012. – 22 мая. – С. 1.*

*Віцебскі рабочы. – 2012. – 26 мая. – С. 1, 5.*

**18 мая** ў г. Віцебску на базе ПУП “Элект” ГА “БелТІЗ” прайшоў абласны конкурс “Спявай, душа!” у рамках парафестывалю аматарскай творчасці інвалідаў.

*Віцебскі АМЦНТ*

Гарадскі фестываль творчасці моладзі “Студенческая весна-2012” быў праведзены ў Полацку. У гэтым годзе ён прысвечаны Году кнігі і 1150-годдзю горада. Па традыцыі фестываль праводзіўся па двух накірунках: мастацкая творчасць і конкурс канцэртных праграм.

*Віцебскі рабочы. – 2012. – 12 мая. – С. 8.*

У Полацку падвялі вынікі трэцяга абласнога конкурсу юных экскурсаводаў музеяў устаноў адукацыі Віцебшчыны. Унікальны ў сваім родзе конкурс праводзіцца па ініцыятыве Віцебскага абласнога аддзялення ГА “Беларускі фонд міру” пры падтрымцы ўпраўленняў адукацыі, культуры, ідэалагічнай работы аблвыканкама, абласнога камітэта ГА “БРСМ”, абласной арганізацыі Беларускага грамадскага аб’яднання ветэранаў. Лаўрэатам конкурсу ў гэтым годзе стала шасцікласніца Суйкаўскай сярэдняй школы Віцебскага раёна *Аляксандра Гвоздзева*.

*Жыццё Прыдзвіння. – 2012. – 19 мая. – С. 3.*

*Віцебскі рабочы. – 2012. – 15 мая. – С. 8.*

**13 мая** ў Лёзненскім раённым Доме культуры прайшоў фінальны этап конкурса дзіцячай творчасці "Я – модель". Галоўнага тытула "Модель-2012" былі ўдастоены *Маргарыта Гусакова* (старэйшая ўзроставая група), *Ліза Арцюхова* (сярэдняя) і *Аліна Зінорава* (малодшая).

*Сцяг Перамогі (Лёзна). – 2012. – 18 мая. – С. 3.*

Свята выхаднога дня на канцэртнай пляцоўцы па вуліцы Суворава ў Віцебску, які арганізаваў аддзел культуры гарвыканкама, напоўніў суботні дзень **19 мая** яркімі фарбамі і вясёлым настроем. Навучэнцы тэатральнага аддзялення школы мастацтваў № 3 "Маладзік" чыталі вершы і басні, а ўдзельнікі вакальнай студыі "Веселые нотки" разам з выкладчыкамі спявалі песні. Працягам свята стаў паказ "Бэйбимод Весна-Лето-2012", на якім маленькія мадэлі подыум-школы агенства "Студия моды Сергея Нагорного" прадэманстравалі новую калекцыю дзіцячага адзення і абутку "ShagoVita".

*Витьбичи=Віцьбічы. – 2012. – 22 мая. – С. 2.*

У Паставах адбылося абласное занальнае свята-конкурс народных ветэранскіх калектываў, прысвечанае 67-й гадавіне Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне. Удзельнічалі 12 калектываў раёнаў і гарадоў.

*Патрыёт (Ушачы). 2012. – 8 мая. – С. 2.*

"Мы вместе – на Ленинской" – так назвалі мясцовыя ўлады свята цэнтральнай вуліцы Шуміліна і 80-годдзя раённай газеты "Герой працы", якое прайшло **18 мая**.

*Народнае слова. – 2012. – 22 мая. – С. 1–2.*

**12 мая** ў Гарадку адбыўся абласны агляд-конкурс харэаграфічных калектываў "Прыдзвінскія карункі", прысвечаны І. А. Серыкаву. У аглядзе ўдзельнічалі 26 калектываў, якія змагаліся за



верша Я. Купалы "Сын і маці", чыталі свае ўласныя вершы аб роднай мове, удзельнічалі ў віктарыне.

**5 красавіка** бібліятэкары Пішчалаўскай сельскай бібліятэкі прапанавалі сваім чытачам літаратурнае вандраванне "Путешествие на Остров книголюбов". Удзельнікі "ўзышлі" на Гару казак, "пераправіліся" праз Раку прыгод, "адпачылі" на Лугавіне апавяданняў. Самых эрудыраваных і начытаных чакаў "скарб": кнігі, якія яны атрымалі ў падарунак.

**11 красавіка** ў раённай бібліятэцы прайшла творчая сустрэча з *А. Масла* і *Н. Бучынскай*. Пісьменніцы расказалі аб сваёй творчасці, падзяліліся планамі на будучыню, адказалі на пытанні чытачоў.

**7 красавіка** ў Зубрэвіцкай сельскай бібліятэцы прайшла гадзіна здароўя "Будь здоров и не болей". На сустрэчу была запрошана загадчыца Зубрэвіцкага ФАПа *І. Ф. Сталбова*, якая засяродзіла ўвагу на захворваннях сардэчна-сасудзістай сістэмы і сродках іх прафілактыкі. Бібліятэкарам быў прапанаваны агляд літаратуры па тэме мерапрыемства.

**26 красавіка** ў Арэхаўскай гарпасялковай бібліятэцы адбылася тэматычная вечарына "Черное солнце", прысвечаная трагедыі на Чарнобыльскай АЭС. Удзельнікі мерапрыемства ўспаміналі падзеі 26-гадовай даўніны, прагучалі ўрыўкі з кніг *С. Алексіевіч* "Чарнобыльская малітва" і *І. Шамякіна* "Злая зорка", быў прадэманстрыраваны фільм "Правда о Чернобыле".

***Браслаўская раённая сетка публічных бібліятэк***

**3 красавіка** бібліятэкар Іказненскай сельскай бібліятэкі правяла літаратурна-музычную кампазіцыю "Мы – славяне", прымеркаваную да Дня яднання Беларусі і Расіі.

**12 красавіка** ў рамках Дня моды на здароўе прайшлі ўрок здароўя "Пірсінг і тату: модна ці небяспечна?" і літаратурны

**19 красавіка** для дзяцей з сацыяльнага прытулку дзіцячая бібліятэка імя Л. М. Талстога арганізавала цікавае падарожжа ў рамках тэатралізаванага свята “Чукоккола – чудесная страна”. Госці адчулі сябе сапраўднымі ўдзельнікамі тэатра-экспромта ў спектаклі па казцы “Муха-Цакатуха”, акрамя таго мерапрыемства было насычана цікавымі загадкамі, конкурсамі і гульнямі.

Супрацьстаянне алкагалізму, асабліва ў моладзевым асяродзі, – важная справа, бо можна і неабходна ўплываць на падлеткаў і дзяцей, каб папярэдзіць магчымыя цяжкія вынікі ўжывання алкагольных напояў. Акцэнт на гэтым зрабіла праграма “Правовой эрудит” у цэнтральнай біліятэцы імя Ф. Скарыны падчас вуснага часопіса “Молодёжь без вредных привычек” **28 красавіка** з вучнямі 7 класа СШ № 2.

У **красавіку** сябар маленькіх дзетак, адзін са старэйшых дзіцячых часопісаў “Вясёлка”, адзначаў дзень нараджэння. Бібліятэка імя Л. М. Талстога арганізавала акцыю “Віншуем “Вясёлку” з юбілеем”. Дзеці неслі ў бібліятэку малюнкі, вершы, розныя віншаванні любімаму часопісу. Некаторыя работы былі высланы на адрас “Вясёлкі” ў Мінск.

Полацк сёлета адзначае 1150-гадовы юбілей. Таму назва і тэма 6-га краязнаўчага турніру, які штогод праходзіць у бібліятэцы імя Я. Купалы, была абрана адразу і хутка – “Полацк юбілейны”. У гэтым годзе ў турніры прынялі ўдзел каманды сярэдніх школ № 6, 8, 16 і Полацкага кадэцкага вучылішча. Барацьба была ўпартай. Вучні складалі пашпарт Полацка, адгадвалі відэазагадкі, паказалі добрае веданне дат і знамянальных падзей горада, рабілі дамашняе заданне – аплікацыю-прэзентацыю Полацка.

***Аршанская раённая сетка публічных бібліятэк***

**3 красавіка** літаратурна-музычную кампазіцыю “Слава кніжцы беларускай” падрыхтавалі і правялі супрацоўнікі Зубаўскай сельскай бібліятэкі. Удзельнікі кампазіцыі інсцэніравалі ўрывак з



перамогу ў трох намінацыях. За лепшае выкананне аўтарскіх танцаў І. А. Серыкава Гран-пры атрымала харэаграфічная група ўзорнага вакальна-харэаграфічнага ансамбля “Перапёлачка” віцебскай гімназіі № 3 (балетмайстар *Валянціна Вішнеўская*). Лепшым за новую балетмайстарскую пастаноўку беларускай накіраванасці быў прызнаны *Сяргей Ракоўскі*, мастацкі кіраўнік народнага ансамбля танца “На ростанях” Віцебскага каледжа культуры і мастацтваў. У намінацыі на лепшы эстрадны танец перамогу атрымаў калектыў гэтай жа ўстановы адукацыі – народная студыя сучаснага танца *Ірыны Бухавецкай*.

*Народнае слова. – 2012. – 22 мая. – С. 8.*

*Віцебскі АМЦНТ*

**24 мая** ў Віцебску ў Летнім амфітэатры шоу-балет Алы Духавай “Тодес” выступіў з сольнай праграмай “NEW”.

*Витебский проспект. – 2012. – 24 мая. – С. 23.*

*Віцебскі рабочы. – 2012. – 29 мая. – С. 8.*

*Витьбичи=Віцьбічы. – 2012. – 31 мая. – С. VII.*

**25 мая** ў Міёрскім РДК адбыўся канцэрт сям’і *Філіпавых* ”У коле сяброў”. Творчая сям’я вядомая далёка за межамі раёна. Глава сям’і *Сяргей Філіпаў* больш за тры дзясяткі гадоў прысвяціў творчай дзейнасці – спевам і музыцы, любоў да якіх прывіў і сваім дзецям – *Марыне, Анастасіі і Арсенію*, якія з’яўляюцца лаўрэатамі міжнародных і рэспубліканскіх конкурсаў.

*Аддзел культуры Міёрскага райвыканкама*

*БІБЛІЯТЭЧНАЯ СПРАВА*

На Прыдзвінні ў Год кнігі заснавана штогадовая літаратурная прэмія імя Петруся Броўкі. Яна будзе прысуджацца ў трох намінацыях: проза, уключаючы публіцыстыку і драматургію, паэзія і проза для дзяцей. Удзельчаць у спаборніцтвах могуць як асобныя аўтары, так і цэлыя калектывы. Жадаючым

прадэманстраваць літаратурныя здольнасці неабходна да **1 снежня** прадаставіць свае творы для разгляду камісіяй. Імёны першых лаўрэатаў будуць вызначаны ў пачатку 2013 года. Пераможцаў чакаюць дыпломы і грашовыя прызы ў памеры 30 базавых велічынь.

*http://vitnews.by/post/2012/06/05/В-Витебскои-области-утверждена-литературная-премия-имени-Петруся-Бровки.aspx*

"Полацк – гонар вякоў" – так называецца новая кніга, што выходзіць да юбілею ў выдавецтве "Беларусь" на 264 старонках, беларускай і рускай мовах з грунтоўным англійскім рэзюмэ. Фотаздымкі да багата ілюстраванага выдання зрабіў навапалачанін *Ігар Супранёнак*. Аўтар тэскту – вядомы беларускі археолаг, кандыдат гістарычных навук, пісьменнік, сцэнарыст *Сяргей Тарасаў*.

*Народнае слова. – 2012. – 24 мая. – С. 15.*

Каля 140 пенсіянераў Полаччыны пачалі асвойваць персанальны камп'ютар. У 12 бібліятэках раёна адкрыліся спецыяльныя курсы для людзей састарэлага ўзросту.

*Віцебскі рабочы. – 2012. – 3 мая. – С. 1.*

"Падары кнігу бібліятэцы" – дабрачынная акцыя пад такой назвай разгорнута ў Шаркаўшчынскім раёне.

*Віцебскі рабочы. – 2012. – 11 мая. – С. 24.*

**21–26 мая** ў Віцебскім абласным цэнтры павышэння кваліфікацыі кіруючых работнікаў і спецыялістаў устаноў культуры прайшлі абласныя курсы бібліятэкараў прафіліраваных бібліятэк, мастакоў сеткі публічных бібліятэк.

*Віцебскі АМЦНТ*

***Віцебская абласная бібліятэка імя У. І. Леніна***

**7 мая** ва Упраўленні ўнутраных спраў Віцебскага аблвыканкама адбылося ўрачыстае мерапрыемства, прысвечанае



аб'яднання *М. С. Усава* (намеснік дырэктара па ідэалагічнай рабоце) і *Т. С. Хаецкая* (інжынер па лесакарыстанні).

Патрыятычны ўрок "А вярнуцца давялося нямногім" да 70-годдзя стварэння *М. П. Шмыровым* першай беларускай партызанскай брыгады прайшоў **9 красавіка** ў бібліятэцы імя У. Маякоўскага. Урок прайшоў з удзелам навуковага супрацоўніка музея імя М. Шмырова *Д. В. Якаўлева*.

"І памятаць страшна, і нельга забыць" – гадзіна развагі па кнізе *Л. Анікеева* "Тайны фашистских концлагерей", прымеркаваная да Міжнароднага дня вызвалення вязняў фашысцкіх канцлагераў адбылася **11 красавіка** ў бібліятэцы імя Я. Купалы.

"Зоркі адной велічыні на небасхіле беларускай паэзіі" – вусны часопіс да 130-годдзя з дня нараджэння Я. Купалы і Я. Коласа **10 красавіка** правялі супрацоўнікі дзіцячай бібліятэкі імя Я. Маўра.

***Полацкая гарадская сетка публічных бібліятэк***

**21 красавіка** адзначаецца Сусветны дзень Зямлі. Да гэтай падзеі ў бібліятэцы імя А. Герцэна адбылася экалагічная мазаіка для вучняў СШ № 9 "Наш дом – Земля". Удзельнікі школьнага тэатральнага кружка падрыхтавалі лялечны спектакль "Здравствуй, первый подснежник!". Загадчык бібліятэкі *Г. В. Маслоўская* пазнаёміла школьнікаў з калекцыяй сапраўдных мінералаў, паведаміла аб залежах і горных пародах у нетрах зямель Беларусі і іншых краін, а таксама пра цікавыя вынаходкі геолагаў.

**13 красавіка** ў цэнтральнай бібліятэцы імя Ф. Скарыны прайшла гадзіна мастацтва для навучэнцаў Полацкага каледжа УА "ВДУ імя П. М. Машэрава", якая мела назву "Художник, влюблённый в море". Мора ў розных яго праявах і выглядах прысутныя ўбачылі на палотнах мастака ў відэароліках, а бібліятэкар паведаміла аб галоўных этапах жыцця *І. К. Айвазоўскага,* жыццёвых выпрабаваннях і адметнасцях творчасці.

*Народнае слова. – 2012. – 3 мая. – С. 8.*

У **красавіку** ў Докшыцкім Доме рамёстваў прайшла персанальная выстава работ майстрыхі клуба “Докша” *Ядвігі Іосіфаўны Маліноўскай*. Прыродны дар і працалюбства дапамаглі Ядвізе Іосіфаўне стварыць цудоўныя па выкананні і мастацкай ідэі вышытыя карціны.

*Родныя вытокі (Докшыцы). – 2012. – 9 мая. – С. 5.*

Мноства вырабаў з разнастайных матэрыялаў прадставілі майстры Прыдзвіння на конкурс “Сувенирный бренд Витебского района”, які прайшоў на базе раённага Цэнтра рамёстваў “Адраджэнне” (аграгарадок Акцябрская). У ім прынялі ўдзел майстры народнага клуба “Традиция” Віцебскага раёна, а таксама кіраўнікі кружкоў і студый дэкаратыўна-прыкладной творчасці ўстаноў культуры са сваімі выхаванцамі. Вынікі былі падведзены ў рамках семінара-практыкума культработнікаў, а перамагла ў конкурсе кіраўнік кружка “Пралеска” РДК *Жанна Фёдарава* са сваёй выцінанкай “Дерево жизни”.

*Жыццё Прыдзвіння (Віцебск). – 2012. – 5 мая. – С. 5.*

***Віцебская гарадская сетка публічных бібліятэк***

**2 красавіка** ўдзельнікі народнай дзіцячай студыі выяўленчага мастацтва Віцебскага абласнога палаца дзяцей і моладзі прадставілі ў дзіцячай бібліятэцы імя М. Астроўскага выставу малюнкаў любімых казачных герояў, прысвечаную Году кнігі – “Чытаем і малюем”. У святочным адкрыцці былі выкарыстаны роставыя лялькі, з дапамогай якіх была праведзена экскурсія па бібліятэцы і віктарына па кнігах у дзіцячай бібліятэцы імя М. Астроўскага.

**4 красавіка** ў дзіцячай бібліятэцы імя Я. Коласа адбыўся экалагічны дыялог “Веліч і хараство беларускіх лясоў”, прысвечаны Міжнароднаму дню леса. На мерапрыемстве прысутнічалі прадстаўнікі Віцебскага дзяржаўнага вытворчага лесагаспадарчага



Дню Перамогі. У рамках гэтага мерапрыемства супрацоўнікамі агульнай чытальнай залы Віцебскай абласной бібліятэкі імя У. І. Леніна была арганізавана кніжная выстава-прагляд ”Великая Победа. Прикоснуться ко времени”.

Урачыстае ўручэнне дыпломаў, ганаровых грамат і памятных прызоў пераможцам творчага конкурсу “Знакамітыя беларусы за мяжой” адбылося **7 мая** ў сектары замежнай літаратуры і нямецкай чытальнай зале. Мерапрыемства праводзілася з мэтай патрыятычнага выхавання і развіцця творчага патэнцыялу моладзі. Да конкурсу дапускаліся творчыя работы, выкананыя на англійскай, нямецкай, рускай альбо беларускай мовах. У конкурсе прынялі ўдзел школьнікі і студэнты.

**8 мая** ў Дзяржаўнай установе дадатковай адукацыі “Віцебскі абласны інстытут развіцця адукацыі” для настаўнікаў фізікі і матэматыкі сярэдніх школ Віцебскай вобласці супрацоўнікамі агульнай чытальнай залы была праведзена прэзентацыя выдання “Нобелеўскія лекцыі – 100 гадоў”.

**11 мая** аддзел дзіцячай літаратуры Віцебскай абласной бібліятэкі імя У. І. Леніна сумесна з УКТП “Віцебскае трамвайна-тралейбуснае ўпраўленне” правялі краязнаўчае падарожжа “Маленькі трамвай вялікага горада”.

**25 мая** адбыліся ўрачыстыя мерапрыемствы, прысвечаныя 1150-годдзю горада Полацка. Да гэтай даты аддзел краязнаўчай літаратуры і бібліяграфіі і аддзел бібліятэказнаўства Віцебскай абласной бібліятэкі імя У. І. Леніна падрыхтавалі разгорнутую кніжную выставу. На літаратурнай пляцоўцы побач з помнікам вялікаму беларускаму асветніку Сімяону Полацкаму жыхары і госці горада Полацка атрымалі магчымасць пазнаёміцца з літаратурай з фонду Віцебскай абласной бібліятэкі.

### *Віцебская гарадская сетка публічных бібліятэк*

“У нашых сэрцах – памяць аб кожным: дзеці вайны ў помніках і скульптурах на тэрыторыі Беларусі” – інфармацыйна-патрыятычны праект да Дня Перамогі, рэалізаваны **2 мая** ў бібліятэцы імя У. Маякоўскага.

**3 мая** ў выставачнай зале бібліятэкі імя Е. Лось адбылося адкрыццё выставы творчых работ чытачкі *Любові Іванаўны Чысцяковай* “Дару цяпло душы сваёй”. Экспазіцыя была прадстаўлена рэпрадукцыямі карцін вядомых мастакоў, аўтарскімі работамі, сярод якіх цыкл карцін з выявамі Міхайлаўскага, а таксама работы, выкананыя ў стылі батык.

“Даражыць сваёй дружбай” – гульнёвая праграма да Дня сям’і прайшла **15 мая** ў бібліятэцы імя Еўфрасінні Полацкай, у якой бралі ўдзел дзеці і выхавацелі ДУ “Дзіцячы дом г. Віцебска”. У мерапрыемстве таксама ўдзельнічала валанцёрская група “Неболит”. Для дзяцей быў арганізаваны салодкі стол, уручаны сувеніры, падорана бібліятэчка літаратуры, сабраная бібліятэкарамі і чытачамі.

“Прывядзі сябра ў бібліятэку!” – пад такой назвай у ЦГБ імя М. Горкага **15 мая** стартавала акцыя, мэтай якой з’яўляецца прыцягненне новых чытачоў. Кожнага, хто падчас акцыі запішацца ў бібліятэку сам і прывядзе з сабой сяброў, чакаюць прыемныя сюрпрызы.

У бібліятэцы імя М. Горкага **29 мая** распачаўся арт-праект “Пад зоркай Шагала”. Адкрыла яго выстава мастака *Андрэя Стурэйкі*, выпускніка мастацка-графічнага факультэта ВДУ імя П. М. Машэрава.

### *Наваполацкая гарадская сетка публічных бібліятэк*

У наваполацкай дзіцячай бібліятэцы імя С. Я. Маршака адбылася цікавая сустрэча юных чытачоў з членамі літаратурных аб’яднанняў “Наддзвінне” і “Літаратурны каўчэг”, прысвечаная 1150-



агляду дзіцячай творчасці “Суквецце маладых талентаў зямлі лёзненскай” была праведзена справаздачная выстава работ васьмі кружкоў раённага Дома рамёстваў за 2011–2012 гады. На выставе было прадстаўлена 140 дзіцячых работ па традыцыйных відах рамёстваў.

*Сцяг Перамогі (Лёзна). – 2012. – 2 мая. – С. 3.*

**26 красавіка** ў Наваполацку адбыўся першы гала-канцэрт гарадскога філіяла Вялікага тэатра оперы і балета Рэспублікі Беларусь. У першым аддзяленні фрагменты з класічных опер “Евгений Онегин”, “Травиата”, “Кармен”, “Дзікае паляванне караля Стаха” на рускай, беларускай і італьянскай мовах выконвалі вядомыя оперныя спевакі – народны артыст Беларусі *Сяргей Франкоўскі*, заслужаныя артысты Рэспублікі Беларусь *Ніна Шарубіна* і *Уладзімір Громаў*. У другім аддзяленні на сцэну выйшлі самыя яркія майстры айчыннага балета – народны артыст Беларусі *Ігар Артамонаў*, лаўрэаты міжнародных конкурсаў *Ягор Азаркевіч*, *Канстанцін Геронік*, *Антон Краўчанка*, *Віталь Пятроўскі*, дзякуючы якім гледачы ўбачылі сцэны са спектакляў “Спящая красавица”, “Эсмеральда”, “Спартак”, “Тарас Бульба” і інш.

*Новая газета (Наваполацк). – 2012. – 2 мая. – С. 1–2.*

*Віцебскі рабочы. – 2012. – 5 мая. – С. 8.*

*Народнае слова. – 2012. – 11 мая. – С. 16.*

**29 красавіка** ў Свята-Успенскім кафедральным саборы адбылася перадача ў дар жыхарам Віцебска факсімільнага выдання Слуцкага Евангелля. З рук прадстаўніка міжнароднага дабрачыннага фонду “Семья – Единение – Отечество” *Сяргея Аграновіча* святое благавешчанне прыняў архіепіскап Віцебскі і Аршанскі *Дзімітрый*. Уладыка затым перадаў кнігу дырэктару цэнтральнай гарадской бібліятэкі імя М. Горкага *Галіне Данілавай*.

*Витебский проспект. – 2012. – 3 мая. – С. 2.*

*Віцебскі рабочы. – 2012. – 3 мая. – С. 3.*

## МЕРАПРЫЕМСТВЫ, ЯКІЯ НЕ ЎВАЙШЛІ Ў ПАПЯРЭДНІ ВЫПУСК

**8 красавіка** падведзены вынікі абласнога агляду-конкурсу “Спасатели глазами детей”. Дзеці ва ўзросце ад 7 да 17 гадоў з розных куткоў Прыдзвіння даслалі на суд журы больш за 200 работ, якія атрымалі высокую адзнаку ў аналагічных гарадскіх і раённых творчых спаборніцтвах.

*Віцебскі рабочы. – 2012. – 11 мая. – С. 23.*

Першы Міжнародны міжвузаўскі фестываль сучаснага танца “Сделай шаг вперед!” прайшоў **17–18 красавіка** ў Віцебску.

*Віцебскі рабочы. – 2012. – 5 мая. – С. 8.*

*Народнае слова. – 2012. – 3 мая. – С. 16.*

Пра што могуць расказаць назвы віцебскіх вуліц? На гэта пытанне ўсім, хто прыйшоў **19 красавіка** ў выставачную залу “Духаўскі круглік” Цэнтра культуры “Віцебск”, памагла знайсці адказ прафесар, доктар філалагічных навук *Ганна Міхайлаўна Мезэнка,* якая з 1983 года займаецца пытаннямі тапанімікі.

*Витебский проспект. – 2012. – 3 мая. – С. 5.*

*Народнае слова. – 2012. – 2 мая. – С. 8.*

**22 красавіка** ў расійскім г. Наваржэве (Пскоўская вобласць) прайшоў фестываль народнай музыкі, прысвечаны заснавальніку сучаснай школы віртуознага выканання на балалайцы Барысу Сяргеевічу Траяноўскаму. У святочным канцэрце прыняў удзел народны ансамбль народнай музыкі і песні “Крынічанька” Палаца культуры Барані.

*Аршанская газета. – 2012. – 5 мая. – С. 5.*

**22 красавіка** ў Полацкім РДК адбылося свята-конкурс выканаўцаў беларускай песні “На зямлі святой Сафіі”, у якім прынялі ўдзел амаль чатыры дзесяткі калектываў і салістаў-вакалістаў.

**22 красавіка** ў Доме культуры г. п. Лёзна ў рамках раённага



годдзю Полацка.

*Новая газета (Наваполацк). – 2012. – 25 мая. – С. 13.*

Яркай падзеяй у культурным жыцці навапалачан стала сустрэча з вядомымі беларускімі аўтарамі *Наталляй Батраковай* і *Юліяй Ляшко* “Літаратурны аўтограф”, ініцыятарамі якой сталі цэнтральная бібліятэка імя У. Маякоўскага і выдавецтва “Регистр”. **10 мая** ў чытальнай зале было каля 200 прыхільнікаў таленту гэтых аўтараў. Папулярныя кнігі *Н. Батраковай* і фільмы па сцэнарыях *Ю. Ляшко* “Рифмуется с любовью”, “Подружка осень” даўно пакарылі сэрцы чытачоў і гледачоў. Жывая размова з цікавымі, таленавітымі людзьмі, іх адказы на пытанні аб тым, як зберагчы шчасце, у чым яго моц, чым жыве сёння беларускае кіно, далі магчымасць прысутным зрабіць вывад, што айчынная літаратура нічым не горшая за папулярныя замежныя творы, аб чым сведчыла чарга за набыццём новых кніг аўтараў і за іх аўтографамі.

Да 1150-годдзя горада Полацка цэнтральная бібліятэка падрыхтавала цыкл мерапрыемстваў “Квітней і слаўся старажытны горад”: **10, 17 і 24 мая** для розных узроставых катэгорый вучняў праведзены гутаркі, віртуальныя экскурсіі, гульні-падарожжы, на якіх дзеці пазнаёміліся з гісторыяй Полацка, помнікамі гісторыі, архітэктуры і культуры, паглядзелі відэаролік “Полацкія музеі”, таксама паслухалі запіс гучання полацкага аргана.

**8 мая** для жыхароў г. п. Баравуха цэнтральная бібліятэка г. Полацка арганізавала ў скверы ля свайго будынку музычную альтанку “И песня тоже воевала”. На вуліцы працавала кніжная выстава ваенных твораў, якія актыўна разбіраліся зацікаўленымі жыхарамі, гучалі песні ваенных гадоў.

### *Полацкая гарадская сетка публічных бібліятэк*

**4 мая** ў дзіцячай бібліятэцы імя Л. М. Талстога адбылася сустрэча “Не старэюць душой ветэраны” з удзельнікам Вялікай

Айчыннай вайны *Мікалаем Піліпавічам Сушковым.* На ёй прысутнічалі дзеці-інваліды, наведвальнікі аддзялення дзённага знаходжання. Бібліятэкар расказала аб гераічных лёсах *Таццяны Марыненка* і *Лілії Касцецкай*. Далей слова ўзяў *Мікалай Піліпавіч*, які распавядаў пра вызваленне Украіны, Польшчы, Чэхаславакіі.

Фальклорнае свята "Этнаград" стала адным з шэрагу юбілейных мерапрыемставаў у гонар 1150-годдзя Полацка. **12 мая** паслухаць фальклор полацкага краю сабраліся ў дзіцячай бібліятэцы-філіяле № 7 вучні СШ № 6 і СШ № 8. Народныя абрадавыя спевы, музыка гучалі ў выкананні ўзорнага фальклорнага калектыву "Знічка". Інтэр'ер залы быў афармлены ў этнічным стылі (дзейнічала выстава "Стары Полацк у прадметах побыту"). Вырабы юных майстроў прапаноўваў кірмаш-продаж, які разгарнуўся тут жа, у межах "Этнаграду".

Сям'я, яе каштоўнасці, узаемаадносіны з роднымі людзьмі – заўсёды актуальная тэма ў сучасным грамадстве. Таму да Сусветнага дня сям'і ў бібліятэцы імя А. Герцэна **19 мая** прайшла вечарына "Сплотить семью поможет мудрость книг". Для жыхароў мікрараёна з творчым канцэртам выступіла палачанка *Галіна Ліфанава*. Яе песні на вершы беларускіх аўтараў склалі цудоўную атмасферу цяпла, дабрыні і разумення.

**24 мая** ў дзіцячай бібліятэцы імя Л. Талстога адбыўся вечар-знаёмства "Біяграфія сям'і ў біяграфіі горада", гасцямі якога сталі цікавыя людзі Полацка.

**25 мая** на святочнай пляцоўцы каля помніка Сімяону Полацкаму распачалася багатая на гасцей і віншаванні літаратурна-музычная гасцёўня "Назаўсёды звязаны з Полацкам", прымеркаваная да 1150-годдзя Полацка і да Года кнігі. У першай частцы праграмы выступілі члены літаратурных аб'яднанняў Полоцка і Наваполацка: "Наддзвінне", "Полоцкая ветвь", "Литературный ковчег", "Крылья". Полацк віншавалі і члены Саюза пісьменнікаў Беларусі*: М. Балдоўскі, І. Рогаль, Т.*



Полацка. У сямі фестывальных канцэртах выступілі Сімфанічны аркестр Белтэлерадыёкампаніі Рэспублікі Беларусь і дырыжор *Кайтэль* (Германія), *Ксенія Пагарэлая* і камерны аркестр "Европа-ЦЕНТР", Дзяржаўны струнны квартэт імя М. І. Глінкі (Расія), музычная капэла "Санорус", музыканты з Кітая, Бельгіі, Італіі, Аўстрыі, Японіі, Дзяржаўны камерны хор Рэспублікі Беларусь і балгарскі тэнар-альціна *Андрэй Найдзёнаў*, навучэнцы і выкладчыкі Полацкай школы мастацтваў.

http://www.novopolotsk.by/content/view/3320/176/

**11 мая** зорка расійскай і сусветнай оперы *Любоў Казарноўская* з трыумфам выступіла ў канцэртнай зале полацкага Сафіскага сабора. Вечар раманса "Дороги любви" стаў яркім заключным акордам XXV Міжнароднага фестывалю старажытнай і сучаснай музыкі, прысвечанага 1150-годдзю Полацка.

*Народнае слова. – 2012. – 19 мая. – С. 8.*

**24 мая** ў абласной філармоніі адбыўся канцэрт камернай музыкі лаўрэата міжнародных конкурсаў актэта балалаек "Віцебскія віртуозы".

*Витебский проспект. – 2012. – 24 мая. – С. 23.*

*КІНАВІДЭАМАСТАЦТВА*

З **21** па **26 мая** віцебскі кінатэатр "Мир" правёў тыдзень франкафоннага кіно. На гэты раз традыцыйнае мерапрыемства прайшло ў іншым фармаце. Да чатырох французскіх фільмаў дабавіліся два швейцарскія. Сярод прадстаўленых карцін пераважаюць драмы: "Прекрасная заноза", "Маленькая комната". Усе кінастужкі суправаджаюцца субцітрамі на рускай мове.

*Віцебскі рабочы. – 2012. – 19 мая. – С. 5.*

больш за сто пачынаючых вакалістаў з усіх рэгіёнаў Беларусі.

*Витьбичи=Віцьбічы. – 2012. – 19 мая. – С. 5.*

**5 мая** ў чацвёрты раз у Лепелі прайшло свята музыкі, прыгажосці, творчасці – абласны фестываль-конкурс “Виват, оркестр-2012”. Ён прысвечаны 200-годдзю Айчыннай вайны 1812 года і сабраў 13 дзіцячых і 5 дарослых калектываў. Лепшымі сярод дарослых сталі народныя духавыя аркестры ААТ “Нафтан” з Наваполацка і гарадскога Цэнтра культуры Оршы. Першае месца сярод дзяцей падзялілі ўзорныя духавыя аркестры Лепельскай ДШМ і ДШМ № 2 Оршы.

*Віцебскі рабочы. – 2012. – 12 мая. – С. 5.*

*Народнае слова. – 2012. – 5 мая. – С. 2.*

У **маі** ў паркетнай зале Віцебскай абласной філармоніі прайшоў “Шляхецкі баль”. Гэты баль, стылізаваны пад XIX стагоддзе, прысвечаны 200-годдзю вайны 1812 года. Асноўнай мэтай яго арганізатараў, а гэта клуб культурна-гістарычнай рэканструкцыі “Паўночная вежа” і маладзёжнае грамадскае аб’яднанне “Гісторыка” ДУ “Культурна-гістарычны комплекс «Залатое кола горада Віцебска “Дзвіна”», стала вывучэнне танцаў эпохі Сярэднявечча, Адраджэння, XIX стагоддзя, беларускіх народных танцаў, а таксама адаптацыя старажытнай танцавальнай культуры да сучасных традыцый.

*Витьбичи=Віцьбічы. – 2012. – 19 мая. – С. 16.*

Навучэнка Сенненскай дзіцячай школы мастацтваў *Кацярына Булыня* (асвойвае ігру на домры) стала бронзавым прызёрам VI Рэспубліканскага конкурсу выканаўцаў на народных інструментах імя І. Жылуновіча.

*Голас Сенненшчыны. – 2012. – 19 мая. – С. 6.*

З **23 сакавіка** па **11 мая** ў канцэртнай зале Сафійскага сабора праходзіў Міжнародны фестываль старажытнай і сучаснай камернай музыкі. Фестываль быў прысвечаны 1150-годдзю г.



*Краснова-Гусачэнка, Б. Беляжэнка, А. Жыгуноў*. Другая частка праграмы літаратурна-музычнай гасцёўні была прысвечана полацкім асветнікам Еўфрасінні Полацкай, Францыску Скарыне і Сімяону Полацкаму. Са сцэны гучалі вершы і духоўна-лірычныя спевы ансамбля “Родник”, прысвечаныя знакамітым палачанам.

### *Аршанская раённая сетка публічных бібліятэк*

Да Дня Перамогі ў бібліятэках Аршанскай ЦБС адбылася акцыя “Победный май – живем и помним”. Яна ўключала тэматычныя вечарыны, літаратурна-музычныя кампазіцыі, камп’ютарныя прэзентацыі, урокі патрыятызму, наведаванні і віншаванні ветэранаў на даму.

**8 мая** Урок патрыятызму “Крещение огнем” прайшоў у Дачненскай сельскай бібліятэцы, у яго падрыхтоўцы прымалі ўдзел члены патрыятычнага клуба “Русічы”. Быў прадэманстраваны фільм “Брестская крепость”.

**15 мая** “Уютный дом и счастье в нем” – літаратурная вечарына была праведзена ў Арэхаўскай сельскай бібліятэцы.

**18 мая** ў рамках правядзення Года кнігі ў Пішчалаўскай сельскай бібліятэцы прайшла літаратурная вечарына “Сокровища поэзии”. Галоўнымі ўдзельнікамі сталі вучні 10 і 11 класаў. Вечарына была прысвечана творчасці паэтаў XX стагоддзя: *М. Цвятаевай, Р. Казаковай, Р. Раждзественскага, Б. Ахмадулінай*. Удзельнікі чыталі вершы, выконвалі песні на словы паэтаў.

### *Бешанковіцкая раённая сетка публічных бібліятэк*

Вельмі цікавай, карыснай і пазнавальнай для падрастаючага пакалення была сустрэча з дзецьмі вайны “Лёсам наканавана выжыць”. Мерапрыемства прайшло **3 мая** ў бібліятэцы аграгарадка Астроўна. Успаміны сведкаў вайны захаплялі, хвалявалі і ў чарговы раз нагадалі нашчадкам пра жахлівыя падзеі

вайны, пра памяць, якая павінна жыць. Для прысутных быў праведзены агляд літаратуры “Я забыть того не вправе” і кніжна-ілюстратыўная экспазіцыя “Негасимый огонь памяти”.

Сямейнае свята “Главная ценность на свете – это семья и дети” адбылося ў Палітаддзельскай сельскай бібліятэцы **13 мая**. На свята былі запрошаны самыя чытаючыя сем’і, а таксама ўсе жадаючыя. У праграму мерапрыемства ўвайшлі творчыя конкурсы, літаратурныя гульні, музычныя нумары. Свята ў бібліятэцы было праведзена сумесна з сельскім клубам.

***Браслаўская раённая сетка публічных бібліятэк***

У рамках Тыдня памяці з **5** па **11 мая** ў Плюскай сельскай бібліятэцы прайшла акцыя “Ветэран жыве побач”, адбыўся ўрок-знаёмства “Новыя творы беларускай паэзіі на старонках перыядычных выданняў” і літаратурна-музычная кампазіцыя “Песни в военной шинели”.

З **7** па **12 мая** дзіцячая бібліятэка прапанавала сваім чытачам мерапрыемствы да Тыдня ваенна-патрыятычнай кнігі “Вайна. Браслаўшчына. Памяць”: кніжную выставу “Трагедыя вайны ў памяці народнай”, экспазіцыю дзіцячых малюнкаў “Дзякуй за мір, ветэраны”, гадзіну памяці “Неўміручы подзвіг народа ў помніках і назвах вуліц”.

**13 мая** Вайнюнскай сельская бібліятэка арганізавала свята “Счастлив тот, кто счастлив дома”.

**17 мая** ў цэнтральнай бібліятэцы прайшоў семінар бібліятэчных работнікаў “Роля бібліятэкі як сучаснага інфармацыйна-культурнага цэнтра ў прапагандзе беларускай літаратуры”. У мерапрыемстве прыняла ўдзел метадыст вучэбна-метадычнага кабінета раённага аддзела адукацыі *В. М. Алёхна*.

**27 мая** дзіцячая бібліятэка запрасіла сваіх чытачоў на Дзень беларускай перыёдыкі, у рамках якога адбылося пасяджэнне



паглядзець “Жаночыя мары” – выставу вырабаў членаў клуба народных майстроў і самадзейных мастакоў “Талака”. Увазе наведвальнікаў прадстаўлена 65 экспанатаў – вышыванак крыжам і гладдзю.

*Народнае слова. – 2012. – 22 мая. – С. 3.*

*Кліч Радзімы (Шаркаўшчына). – 2012. – 23 мая. – С. 3.*

*ТЭАТРАЛЬНАЕ ЖЫЦЦЁ*

Званне заслужанага артыста Рэспублікі Беларусь атрымаў акцёр Нацыянальнага тэатра імя Я. Коласа *Валянцін Салаўёў*. Вядучым майстрам сцэны *Генадзю Гайдуку*, *Ніне Куляшовай (Левашовай)*, *Георгію Лойку* ўручаны медалі Францыска Скарыны.

*Народнае слова. – 2012. – 22 мая. – С. 1.*

*Витебский проспект. – 2012. – 24 мая. – С. 2.*

**25 мая** адбыўся юбілейны вечар вядучай актрысы Нацыянальнага тэатра імя Я. Коласа *Святланы Жукоўскай.*

*Витебский проспект. – 2012. – 24 мая. – С. 22.*

*Народнае слова. – 2012. – 26 мая. – С. 8.*

Адзін з выдатных твораў Лесі Украінкі – паэма “Лясная песня” — знайшоў сваё адлюстраванне на сцэне Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя Я. Коласа. Нядаўна першыя гледачы ўбачылі прэм’ерны спектакль “Легенда пра каханне” па матывах твора вялікай украінскай паэткі. Пастаноўку ажыццявіў Юрый Лізянгевіч.

*Витьбичи=Віцьбічы. – 2012. – 29 мая. – С.7.*

*МУЗЫЧНАЕ ЖЫЦЦЁ*

Дзесяцігадовая навучэнка Лепельскай дзіцячай школы мастацтваў *Яна Стрэльчанка* заваявала Гран-пры на адкрытым рэспубліканскім конкурсе эстраднай песні “Новые имена” (ва ўзроставай групе 7–10 гадоў). У творчым спаборніцтве ўдзельнічалі

ткацтва, саломапляцення, роспісу па дрэве, лапікавага шыцця.

*Веснік Глыбоччыны. – 2012. – 8 мая. – С. 7.*

**19 мая** ў Полацкім Цэнтры рамёстваў і нацыянальных культуры падведзены вынікі адкрытага гарадскога конкурсу-выставы “Полацк-квілт-2012”. Яго назва – “Стагоддзяў повязь”, бо конкурс прысвечаны 1150-гадоваму юбілею горада. На суд журы было адабрана 39 работ з Беларусі, Расіі і Японіі.

*Віцебскі рабочы. – 2012. – 17 мая. – С. 23.*

*Народнае слова. – 2012. – 17 мая. – С. 16.*

**19 мая** адбылася выязная выстава дэкаратыўна-прыкладнога і выяўленчага народнага мастацтва "Букет Талачыншчыны" раённага Дома рамёстваў у рамках VI Рэспубліканскага фестывалю-кірмашу рамёстваў "Вясновы букет" (г. Мінск).

*Аддзел культуры Талачынскага райвыканкама*

Вядомы “Полоцкий оберег”, створаны да 1145-годдзя Полацка, на 1150-гадовы юбілей горада прадстаўлены ў залах мясцовага Цэнтра рамёстваў і нацыянальных культур. У яго стварэнні прынялі удзел прадстаўнікі Беларусі, Расіі, Прыбалтыкі, Малдовы, Германіі, Даніі, Аргенціны.

*Віцебскі рабочы. – 2012. – 22 мая. – С. 8.*

*Народнае слова. – 2012. – 24 мая. – С. 16.*

Урачыстае адкрыццё выставы “Мир семьи” Віцебскага грамадскага аб’яднання шматдзетных бацькоў “Покров” у культурна-гістарычны комплексе «Залатое кола горада Віцебска “Дзвіна”» атрымалася радасным, кранальным. Тут былі прадстаўлены работы членаў 54 шматдзетных сем’яў: малюнкі, вышыўкі, упрыгожванні, дэкаратыўныя вырабы.

*Віцебскі рабочы. – 2012. – 19 мая. – С. 8.*

*Жыццё Прыдзвіння. – 2012. – 19 мая. – С. 3.*

Шаркаўшчынскі раённы Цэнтр рамёстваў запрашае



аматарскага клуба “Сустрэча”: “Наша прэса на ўсе інтарэсы”, праведзены бібліяграфічны агляд “Знаний немало дают нам журналы” і рэйтынг-агляд лепшых газет і часопісаў. У мерапрыемстве прыняў удзел галоўны рэдактар раённай газеты “Браслаўская звязда” *К. М. Пятушка*.

**30 мая** для бібліятэкараў сістэмы была арганізавана экскурсія ў філіял літаратурнага музея Я. Купалы “Ляўкі”.

***Верхнядзвінская раённая сетка публічных бібліятэк***

**8 мая** да Дня Перамогі ў Асвейскай гарпасялковай бібліятэцы прайшоў літаратурны вечар “Апалены світанак”, а ў Сар’янскай – літаратурны вечар “Мы захавалі для нашчадкаў мір”.

**29 мая** ў ЦРБ адбыўся ўрок-прэзентацыя “И снова ратной даты слава”, прысвечаны Айчыннай вайне 1812 года.

***Дубровенская раённая сетка публічных бібліятэк***

**3 мая** дзіцячая бібліятэка запрасіла чытачоў малодшага школьнага ўзросту на ранішнік, прысвечаны 130-годдзю з дня нараджэння К. І. Чукоўскага “Добрыя кнігі добрага чалавека”.

Літаратурна-музычная кампазіцыя “Цветы и порох” прайшла **3 мая** ў Асінторфскай сельскай бібліятэцы і была прысвечана Дню Перамогі.

У бібліятэцы аграгардка Станіславова ў **маі** адбыўся тэматычны вечар “Память, память, за собою позови”.

Усе бібліятэкі раёна прынялі ўдзел у семінары для бібліятэкараў сістэмы “Экалагічная асвета – аснова трэцяга тысячагоддзя”, у рамках якога прайшоў раённы конкурс чытальнікаў “Жывая планета – жывая душа”.

***Лёзненская раённая сетка публічных бібліятэк***

**4 мая** ў цэнтральнай раённай бібліятэцы адбыўся семінар

для супрацоўнікаў сельскіх бібліятэк сістэмы “Деятельность библиотек по социальной адаптации социально незащищенных групп населения и обслуживание людей с ограниченными возможностями”. У рабоце семінара прынялі ўдзел: *Т. А. Кальмакова*, нам. начальніка па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Лёзненскага раённага выканаўчага камітэта; *Г. У. Папкова*, дырэктар Тэрытарыяльнага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва; *А. А. Вараб'ёва*, начальнік аддзела пенсійнага забеспячэння і сацыяльнай падтрымкі насельніцтва.

**13 мая** да Дня сям’і цэнтральная раённая бібліятэка запрасіла сваіх чытачоў на дзень сумеснага адпачынку “Семья – это любовь”.

**30 мая** ў дзіцячай бібліятэцы прайшоў урок прыгажосці "Васильковая муза Шагала”, прысвечаны 125-годдзю знакамітага земляка. Урок дапоўнілі фільм "Виртуальная галерея", буклет "Лиозненские мотивы в творчестве Шагала" і зборнік вершаў мясцовай паэтэсы *В. Пячонавай* "Шагаловский венок". Да мерапрыемства была афармлена кніжна-ілюстраваная выстава.

***Лепельская раённая сетка публічных бібліятэк***

У цэнтральнай раённай бібліятэцы на працягу месяца прайшлі наступныя мерапрыемствы:

**9 мая** на святкаванні Дня Перамогі ў гарадскім парку на танцавальнай пляцоўцы работнікі аддзела абслугоўвання і інфармацыі прапанавалі літаратурны вернісаж “Память о войне нам книга оставляет”;

**11 мая** да Дня сям’і прайшла скайп-канферэнцыя “Семья – маленькое государство”. У ёй прынялі ўдзел людзі з абмежаванымі магчымасцямі з Лепельскага раённага таварыства інвалідаў і расійскага горада Балахна Ніжагародскай вобласці;

**15 мая** была праведзена сустрэча з членам Віцебскага



музеі. Мастак мае яркую, адразу пазнавальную жывапісную манеру, якая чымсьці нагадвае і мазаіку, і фрэскі, а таксама пуантылізм Жоржа Сёра і Поля Сіньяка.

*Витебский проспект. – 2012. – 24 мая. – С. 23.*

Па выніках пленэра і абласнога конкурсу сярод навучэнцаў дзіцячых школ мастацтваў у Мастацкім музеі Віцебска адкрылася выстава работ “Война 1812 года в изобразительном искусстве”. Выстава, прысвечаная 200-годдзю з дня напалеонаўскіх баталій, дапаможа гледачу дакрануцца да гісторыі, даць магчымасць адчуць асаблівае значэнне мінулага.

*Віцебскі рабочы. – 2012. – 29 мая. – С. 8.*

У Мастацкай галерэі г. Полацка адкрылася выстава “Вобраз Прасвятой Багародзіцы ў беларускім іканапісе XVII–XIX стагоддзяў” з фондаў Нацыянальнага мастацкага музея Беларусі. На ёй прадстаўлены 32 творы, 12 з якіх адрэстаўраваны ў 2011 годзе і па-за сценамі музея экспануюцца ўпершыню. Разам з іконамі з фондаў Нацыянальнага гісторыка-культурнага музея-запаведніка яны будуць выдадзены ў каталогу, які рыхтуецца да друку.

*Полацкі веснік. – 2012. – 11 мая. – С. 15.*

У выставачнай зале Лепельскага раённага краязнаўчага музея ў самым разгары “лета”. Блакітныя васількі і незабудкі, пунсовыя цюльпаны і макі, рознакаляровыя ружы і браткі сагрэюць і парадуюць кожнага, хто наведае выставу “Вышыўка 1960–1980-х гадоў”.

*Лепельскі край. – 2012. – 2 мая. – С. 3.*

*ДЭКАРАТЫЎНА-ПРЫКЛАДНОЕ МАСТАЦТВА*

У Галубіцкім Цэнтры культуры майстры Дома рамёстваў і народнага клуба “Крыніца” правялі “Свята народных рамёстваў” для дзяцей з Галубіцкай, Кіраўскай і Ураджайнаўскіх школ. Майстры падрыхтавалі невялікую выставу вырабаў, выкананых у тэхніках

*Витебский проспект. – 2012. – 10 мая. – С. 22.*

Незвычайная выстава работ мастака *Алеся Мемуса* экспануецца ў Арт-цэнтры Марка Шагала. Серыя алейных “опусаў-забаў” пад назвай “Двое” прысвечана спадарожніцы жыцця аўтара *Ірыне Магучай*, якая была непасрэднай саўдзельніцай іх стварэння.

*Віцебскі рабочы. – 2012. – 17 мая. – С. 23.*

*Народнае слова. – 2012. – 26 мая. – С. 7.*

*Витьбичи=Віцьбічы. – 2012. – 29 мая. – С. 7.*

**24 мая** ў Мастацкім музеі адкрылася выстава работ вядомага віцебскага скульптара *Валерыя Магучага*, а фактычна аўтар экспануе свой “Дар городу”. Упершыню аўтару, які перадаў свае творы ў дар, уручаны музейны сертыфікат, якая пацвярджае факт перадачы ў фонды мастацкіх работ.

*Витьбичи=Віцьбічы. – 2012. – 29 мая. – С. 2.*

*Народнае слова. – 2012. – 31 мая. – С. 7.*

З **24 мая** ў Мастацкай галерэі працуе выстава “Беларускія мастакі – Полацку”, прысвечаная 1150-годдзю старажытнага горада. Выстава арганізавана Нацыянальным Полацкім гісторыка-культурным музеем-запаведнікам сумесна з Беларускім саюзам мастакоў.

http: // museum. by

З **28 мая** па **3 чэрвеня** ў скверы Маякоўскага ў Віцебску працуе выстава фотаработ “Беларусь без сирот”. Героі фотаздымкаў – выхаванцы дзіцячага дома абласнога цэнтра. Арганізатары спадзяюцца, што мерапрыемства прыцягне ўвагу да праблемы сіротства ў горадзе, вобласці, рэспубліцы.

*Віцебскі рабочы. – 2012. – 26 мая. – С. 1.*

*Народнае слова. – 2012. – 31 мая. – С. 2.*

*Витьбичи=Віцьбічы. – 2012. – 31 мая. – С. I.*

*Витебский проспект. – 2012. – 31мая. – С. 23*

Выстава работ *Віктара Ціханава* адкрылася ў Мастацкім



аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі *А. І . Нафрановічам* “У пошуках ісціны”;

**17 мая** ў клубе “Добрыя сустрэчы” да Дня Перамогі адбыўся экскурс у гісторыю “Ветераны всегда в строю, даже если они не с нами”. У праграме: слайд-прэзентацыя ”Памяць зніклых вёсак”, віктарына “Ішла песня па вайне”;

**23 мая** ў галерэі “Арт-Лепель” адбылося адкрыццё выніковай выставы “Вясеннія фарбачкі” навучэнцаў ДШМ;

**24 мая** ў Публічным цэнтры прававой інфармацыі прайшла юрыдычная кансультацыя “Віды паслуг, якія аказвае натарыяльная кантора”. На пытанні прысутных адказвала загадчык натарыяльнай канторы Лепельскага раёна *Л. М. Заляціла*;

**30 мая** кіналекторый “Синема – открытое окно” запрасіў людзей з абмежаванымі магчымасцямі на мастацкі фільм “Выкрутасы”.

**18 мая** прайшло тэатралізаванае прадстаўленне-экскурсія па Лепельскай дзіцячай бібліятэцы “Как заяц-Хваста записался в библиотеку”.

У рамках мэтавай праграмы ў падтрымку кнігі і чытання “Мастацкая літаратура – крыніца духоўнасці” **5 мая** ў Грыгаравічскай сельскай бібліятэцы-клубе праведзена кніжная выстава “Зорка беларускай літаратуры”, прысвечаная 65-годдзю *Р. Баравіковай.*

### *Міёрская раённая сетка публічных бібліятэк*

**8 мая** ў Міёрскай дзіцячай бібліятэцы адбыўся вечар-сустрэча “Што так сэрца растрывожыла” з *Тамарай Георгіеўнай Капітанавай*. Жанчына ўспамінала падзеі вайны, пасляваенны час, працу ў сістэме адукацыі, адказвала на пытанні прысутных.

Да Сусветнага дня сям’і ў бібліятэках Міёрскай ЦБС былі арганізаваны агляды літаратуры, тэматычныя кніжныя паліцы,

конкурсныя праграмы, сямейныя тэматычныя вечары “Святло сям’і”, “Усё пачынаецца з сям’і” і інш.

**17 мая** Міёрская цэнтральная бібліятэка запрасіла выкладчыкаў беларускай мовы і літаратуры, намеснікаў дырэктараў па выхаваўчай рабоце школ горада, маладых творцаў і проста аматараў паэзіі на літаратурную вэб-канферэнцыю “Творчасць – душы палёт”, прысвечаную юбілею земляка, паэта, перакладчыка, краязнаўца *Сяргея Панізніка*. Мерапрыемства было падрыхтавана сумесна з Міёрскім гісторыка-этнаграфічным музеем. Да ўвагі прысутных была прапанавана невялікая экспазіцыя з калекцыі Сяргея Сцяпанавіча і кніжная выстава “Я сын твой, прыдзвінскі мой край дарагі!”. Віншаванні юбіляр прымаў праз інтэрнэт.

**27 мая** гадзіна духоўнасці “Вера – сэнс жыцця хрысціянскага” прайшла ў Міёрскай дзіцячай бібліятэцы. На мерапрыемства былі запрошаны вучні старэйшых класаў гарадскіх школ і выкладчыкі нядзельных школ горада. Размова вялася пра сэнс чалавечага жыцця, пра ўплыў кнігі на светапогляд чалавека і г. д. Для ўдзельнікаў мерапрыемства былі арганізаваны відэапрагляд фільмаў духоўнай тэматыкі і выстава новых паступленняў літаратуры.

**30 мая** на базе бібліятэкі аграгарадка Чапукі быў арганізаваны для бібліятэчных работнікаў раёна семінар на тэму “Кніга ў жыцці асобы і грамадства”. Размова вялася аб арганізацыі ў сельскай бібліятэцы вольнага часу дзяцей і падлеткаў.

***Пастаўская раённая сетка публічных бібліятэк***

**16 мая** ў Варапаеўскай бібліятэцы-музеі дзіцячай творчасці адбыўся семінар бібліятэкараў ЦБС “Детское чтение: проблемы и перспективы”. Пасля выступлення загадчыцы аддзела маркетынгу *Н. А. Балошка* былі заслуханы паведамленні аб рабоце з дзіцячым чытачом *Л. С. Жук*, *С. У. Пекарскай, С. Э. Пагоцкай, Л. А.*



праходзіць конкурс патрыятычнай песні, прысвечаны яго памяці.

*Народнае слова. – 2012. – 22 мая. – С. 3.*

*Віцебскі рабочы. – 2012. – 26 мая. – С. 3.*

*ВЫЯЎЛЕНЧАЕ МАСТАЦТВА*

Вядомыя беларускія мастакі *Іраіда Мікалаеўна* і *Генадзь Фёдаравіч Шутавы* прадставілі ў Мастацкім музеі выставу акварэлі “Параллельные миры искусства” (нацюрморт, пейзаж).

*Витебский проспект. – 2012. – 3 мая. – С. 23.*

*Народнае слова. – 2012. – 5 мая. – С. 8.*

У краязнаўчым музеі Віцебска экспануецца выстава работ *Таццяны Беразоўскай* “Знаки”. Цікавасць да руністыкі як да містычнай знакавай сістэмы славян прывяла мастачку да цэлай серыі жывапісных работ.

*Витебский проспект. – 2012. – 3 мая. – С. 23.*

У выставачнай зале Цэнтра сучаснага мастацтва напярэдадні Вялікай Перамогі адкрылася выстава работ савецкага мастака-станкавіста, плакатыста, ілюстратара *Міхаіла Рудакова.* Мастака даўно няма ў жывых, але яго выставы рэгулярна праводзяцца не толькі на тэрыторыі былога Саюза, але і за мяжой. У нас у горадзе прадстаўлена больш за 50 яго графічных і жывапісных работ. Гэта мноства ілюстрацый да вядомых кніг “Горячий снег” *Юрыя Бондарава*, “Волоколамское шоссе” *Аляксандра Бека*, “Танки идут ромбом” *Анатоля Ананьева* і іншыя.

*Витебский проспект. – 2012. – 10 мая. – С. 23.*

*Народнае слова. – 2012. – 11 мая. – С. 15.*

Выстава “Эта сладкая жизнь” пачалася ў Цэнтры сучаснага мастацтва. Малады мінскі мастак *Уладзімір Царыковіч* ужо ў другі раз прадставіў у Віцебску свае работы. На стварэнне карцін, якія прадстаўлены ў гэтай экспазіцыі, аўтара натхніла разнастайнасць і эмацыянальнасць жыцця ў кафэ, са сваімі законамі і тайнамі.

майстэрства яна была прынята ў Беларускі саюз майстроў народнай творчасці.

*Витьбичи=Віцьбічы. – 2012. – 22 мая. – С. 2.*

У Віцебскім музеі воінаў-інтэрнацыяналістаў адкрылася экспазіцыя, прысвечаная ваеннаму лётчыку 1-га класа палкоўніку ваенна-транспартнай авіяцыі *Міхаілу Фёдаравічу Камарчуку*.

*Віцебскі рабочы. – 2012. – 19 мая. – С. 4.*

## МАСТАЦТВА

*АХОВА ПОМНІКАЎ*

**5 мая** на гарадскіх могілках "Мазурино" адбылося ўрачыстае адкрыццё манумента Ганароваму грамадзяніну Віцебска *Валянціну Васільевічу Міхельсону.*

*Витьбичи=Віцьбічы. – 2012. – 11 мая. – С. 2.*

*АРХІТЭКТУРА*

Напярэдадні святкавання Дня Перамогі ў Полацку прайшоў урачысты мітынг, прысвечаны адкрыццю мемарыяльнай дошкі Герою Савецкага Саюза *Аляксандру Дзмітрыевічу Валогіну* ў мікрараёне "Баравуха-3".

*Полацкі веснік. – 2012. – 18 мая. – С. 8.*

У Віцебску адкрылі мемарыяльную дошку ў гонар *Аляксандра Лявонцьевіча Радзюка* і ўсіх міліцыянераў – абаронцаў горада ў ліпені 1941 года. Зрабіў яе скульптар *Азат Тарасян.*

*Віцебскі рабочы. – 2012. – 11 мая. – С. 3.*

**19 мая** ў віцебскай СШ № 3 адкрыта мемарыяльная дошка ў гонар выпускніка школы *Леаніда Бяліцкага*, які загінуў пры выкананні службовага долгу ў Афганістане. За мужнасць і гераізм узнагароджаны медалём "За адвагу", ордэнам Чырвонай Зоркі і ордэнам Леніна (пасмяротна). Яго імя носіць вуліца ў абласным цэнтры, піянерская дружына, ужо больш за дзесяць гадоў у Лужасна



*Валадзько, Г. І. Хацяновіч*. Падвяла вынікі бібліятэкар Норыцкай сельскай бібліятэкі *Л. Б. Паганько*. Увазе прысутных было прадстаўлена "Свята ветлівых рабят" па выхаванні этыкету ў падрастаючага пакалення. Да дзяцей у госці завітала Яе Вялікасць Каралева Ветлівасць (у ролі выступіла бібліятэкар Дунілавічскай сельскай бібліятэкі *А. Пашкова*), праведзены конкурс знатакоў этыкету, падарожжа ў краіну добрых і злых учынкаў.

**29 мая** ў памяшканні цэнтральнай раённай бібліятэкі прайшла літаратурная прэзентацыя кніг мясцовага паэта, краязнаўца *Ігара Міхайлавіча Пракаповіча*: "Назвы вуліц горада Паставы" (у сааўтарстве з *Віталем Літвіновічам*), "Памяткі першай сусветнай вайны на Пастаўшчыне" (у сааўтарстве з дачкой *Юліяй Пракаповіч)*, "Храналогія гісторыі Пастаўскага раёна".

### *Полацкая раённая сетка публічных бібліятэк*

Прэзентацыя кнігі "Легенды і паданні Полацкай зямлі" прайшла **3 мая** ў Полацкай цэнтральнай бібліятэцы. Мерапрыемства было падрыхтавана сумесна з Полацкім Цэнтрам рамёстваў, Сільніцкай бібліятэкай-музеем этнаграфіі, фальклорным калектывам "Суседкі" Сільніцкага ДК.

**9 мая** на вечар-памяць "Песня в военной шинели" запрасіла сваіх чытачоў Ветрынская гарпасялковая бібліятэка. На сустрэчу былі запрошаны ветэраны вайны і працы.

У Бабыніцкай бібліятэцы-клубе **9 мая** адбылася літаратурная гадзіна "А сэрца памятае кожны бой".

**13 мая** для дзяцей малодшага і сярэдняга школьнага ўзросту ў Кушлікоўскай сельскай бібліятэцы праведзены паэтычны вечар "Наш герб і наш сцяг – гэта сімвал свабоды".

**15 мая** Грамашчанская сельская бібліятэка-клуб сумесна з сельскім Саветам правяла вячоркі "Пад сямейным абажурам", а для

дзяцей старэйшага школьнага ўзросту прайшла конкурсная праграма “Калейдоскоп профессий”.

**29 мая** ў Полацкай цэнтральнай бібліятэцы адбыўся раённы семінар бібліятэкараў раёна “Ваенна-патрыятычнае выхаванне дзяцей і падлеткаў”. Удзел у семінары прынялі супрацоўнікі філіяла краязнаўчага музея “Поле ратнай славы”. У праграме: экскурсіі на “Поле ратнай Славы” каля в. Гомель Полацкага раёна, кансультацыя “Ваенна-патрыятычнае выхаванне дзяцей”, бібліяграфічны агляд “Сэрцы, апаленыя вайной”, знаёмства з вопытам работы Ветрынскай гарпасялковай бібліятэкі-філіяла № 2, Ветрынскай бібліятэкі-філіяла № 6, Багатырскай бібліятэкі-філіяла № 48 па тэме “Паважаць мінулае, жыць сучасным, думаць аб будучым”.

***Сенненская раённая сетка публічных бібліятэк***

Бібліятэкі сістэмы адзначалі День Перамогі. Ладзіліся ўрокі мужнасці, вечары-сустрэчы, літаратурна-музычныя кампазіцыі, патрыятычныя ўрокі, гадзіны мужнасці і салдацкай славы, урокі памяці, літаратурныя віктарыны і конкурсы. Былі афармлены кніжныя выставы.

На вечар-сустрэчу “Цяжкая дарога да Вялікай Перамогі” ў Сенненскую раённую дзіцячую бібліятэку былі запрошаны ветэраны Вялікай Айчыннай вайны і вучні шостых класаў. Дзеці пачулі расказы аб вайне, чыталі вершы і сачыненні аб жудасных ваенных днях. На пасяджэнні клуба “Спадчына” ў Сенненскай ЦРБ на ўроку мужнасці “Храните память о подвиге военном” прысутныя пазнаёміліся з лепшымі творамі аб вайне, паглядзелі кінафільм.

Сінягорская бібліятэка-музей этнаграфіі арганізавала патрыятычны ўрок да 105-годдзя з дня нараджэння Героя Савецкага Саюза, нашага земляка *М. Гараўца* “Ён назаўсёды застаўся ў Беларусі”. Яноўская бібліятэка сумесна з Домам



касмадрома "Байканур" *Калужонкам Генадзем Іванавічам*. Дзеці з цікавасцю паслухалі чалавека з незвычайнай для Полацка прафесіяй. Госці музея даведаліся, як у жыццё людзей увайшла тэма космаса і як жыхары Полацка ўспрымалі весткі пра касмічныя палёты. На выставе можна ўбачыць рэчы першага беларускага касманаўта *Пятра Клімука* і віцэ-прэзідэнта Расійскай Акадэміі навук *Анатолія Грыгор'ева*.

http://polotsk.museum.by/node/30695

**25 мая** пасля працяглага рамонту пачаў прымаць наведвальнікаў Музей беларускага кнігадрукавання. У межах падзей і мерапрыемстваў, прымеркаваных да святкавання Дня горада, распачала работу выстаўка “Лепшыя кнігі Беларусі”, дзе экспануюцца кнігі-лаўрэаты LI Нацыянальнага конкурсу “Мастацтва кнігі Беларусі-2012”, прадстаўленыя Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Выстаўка працуе да **3 чэрвеня**.

У экспазіцыйнай зале, якая распавядае пра жыццёвы і творчы шлях беларускага першадрукара, прайшла выстава аднаго дня. На працягу чатырох гадзін, з 13.00 да 17.00, кожны наведвальнік мог убачыць адну з першых друкаваных беларускіх кніг, арыгінальнае выданне Францыска Скарыны са збору Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі – “Кнігу Іова”, надрукаваную ў Празе ў верасні 1517 года. Падчас святкаванняў музей наведаў міністр культуры Павел Латушка, які выказаў падзяку кіраўніцтву музея за захаванне і папулярызацыю беларускай мовы.

*http://museum.by/node/3088*

У Музеі прыватных калекцый адкрылася новая выстава “Бисерная симфония”, на якой прадстаўлены арыгінальныя жаночыя ўпрыгожванні. Іх аўтар – *Інга Сампоева.* Аўтар прымае удзел у “Горадзе майстроў” на “Славянскім базары ў Віцебску”. У 2011 годзе на выставе-конкурсе “Калядныя ўзоры” ў Мінску работы Інгі заваявалі дыплом першай ступені. За высокі ўзровень

адбыўся перфоманс “Театр в оконных рамах”. Акцёры тэатра ”Колесо” сыгралі невялікія сцэнкі, сімвалічна запальваючы святло ў вокнах з надзеяй, што месца, дзе тварылі Шагал і Малевіч, будзе ажыўлённым не толькі ў гэтую ноч. Каля ўваходу ў музей “Віцебскі цэнтр сучаснага мастацтва” “AGNI show” парадавала гасцей фаер-шоу.

*Витьбичи=Віцьбічы. – 2012. – 22 мая. – С. 2, 7.*

*Витебский прспект. – 2012. – 24 мая. – С. 23.*

*Віцебскі рабочы. – 2012. – 24 мая. – С. 10.*

“Ноч музеяў” прайшла і ў Браславе. Наведвальнікам былі прадстаўлены адразу дзве выставы: мастак *Алесь Суровы* сабраў свае работы ў тэматычную групу “Гісторыя аднаго хлява”, а фатограф *Руслан Халімончык* і *Юрый Палуцкі* падрыхтавалі для браслаўчан эратычную выставу пад назвай “НЮансы”. Нечаканым сюрпрызам быў невялікі канцэрт вядомага барда *Віктара Шалкевіча*. Свае лепшыя нумары выканалі самадзейныя артысты тэатра мініяцюр “Покер”, а на заканчэнне адбылося чароўнае фаер-шоу.

*Браслаўская звязда. – 2012. – 26 мая. – С. 7.*

Да Міжнароднага дня музеяў Лепельскі раённы краязнаўчы музей падрыхтаваў “Ретро-вечеринку в стиле 1970-х годов”. У праграме: паказ моднага адзення 1970-х гг. (дэфіле), канцэртная праграма, танцы пад грампласцінкі, выстава музычнага абсталявання. З **3 мая** па **30 чэрвеня** музей запрашае наведаць тэматычную выставу-экскурсію “Они прошли по той войне…” (Героям Савецкага Саюза прысвячаецца…).

*http://museum.lepel.by/*

У рамках правядзення акцыі “Ноч музеяў-2012” у краязнаўчым музеі г. Полацка была адкрыта выстава "МАРШРУТ: ЗЯМЛЯ–КОСМАС–ЗЯМЛЯ". У дзень адкрыцця адбылася сустрэча вучняў гімназіі № 1 г. Наваполацка з былым супрацоўнікам



культуры і школай правяла літаратурна-музычную кампазіцыю “Мужнасці вечны агонь”. У Машканскай сельскай бібліятэцы пройшоў урок памяці “Был трудный бой”. Дзеці і падлеткі ў Багданаўскай сельскай бібліятэцы ўдзельнічалі ў конкурсе “Дзяцінства і вайна ў вершах беларускіх пісьменнікаў”. Ходцаўская сельская бібліятэка пазнаёміла сваіх чытачоў з сімваламі нашай Радзімы на інфармацыйнай гадзіне “Государственные символы страны – символы свободы”. Чырвонасельская бібліятэка і СДК адзначылі Дзень сям’і. Бацькі і іх дзеці завіталі сюды на свята “Вечар дружнай сям’і”.

### *Ушацкая раённая сетка публічных бібліятэк*

Урок патрыятызму “Давайте, люди, не забудем великий подвиг земляков” прайшоў **4 мая** ва Ушацкай ЦРБ.

**13 мая** на літаратурны вечар “В кругу семьи” запрасіла сваіх чытачоў гарпасялковая бібліятэка.

**14 мая** ў дзіцячай бібліятэцы адбылася гутарка “Наш Герб і Сцяг – гэта сімвалы свабоды”.

### *Шаркаўшчынская раённая сетка публічных бібліятэк*

**18 мая** ў Германавіцкай сельскай бібліятэцы прайшла сустрэча з членамі літаратурнага аб’яднання “Світанак”, на якую былі запрошаны самыя актыўныя чытачы і бібліятэкары Германавіцкага сельскага Савета. Удзельнікі сустэрчы захапляліся вершамі *Кацярыны Сосна, Віктара Лагуна*, *Таццяны Еўдаковай, Надзеі Паляк*. *Міледзій Кукуць* паведаміў аб тым, што ў выдавецтве “Мастацкая літаратура” ў хуткім часе выйдзе яго аповесць “Самотная зорка Венера”. *Ірына Тарбецкая* ў сваю чаргу зрабіла рэкламу сваёй кнігі для дзяцей “Прыгоды Гарушы”.

**21 мая** ў памяшканні Іёдскай сельскай бібліятэкі адбылася сустрэча з пляменніцай *Міхася Машары Зояй Міленцьеўнай*

*Лаўрыновіч*. На сустрэчу прыйшлі вучні і настаўнікі Іёдскай школы. З нагоды 110-годдзя з дня нараджэння пісьменніка-земляка ў бібліятэцы была афармлена выстава, на якой бібліятэкар прапанавала прысутным цікавую падборку матэрыялаў. Госць сустрэчы вельмі цікава і захапляльна расказвала пра жыццёвы і творчы шлях свайго дзядзькі, паказвала сямейныя альбомы са старымі фотаздымкамі. Напрыканцы выступлення Зоя Міленцьеўна прачытала павучальную казку “Зязюльчыны слёзы”, а дзеці чыталі вершы *М. Машары*.

**24 мая** ў Шаркаўшчынскай дзіцячай бібліятэцы адкрылася выстава “Рисуют дети”, прысвечаная Міжнароднаму дню абароны дзяцей. На выставе прадстаўлены работы выхаванцаў кружка “Весёлая кисточка” Шаркаўшчынскага раённага цэнтра дзяцей і падлеткаў. Для юных наведвальнікаў бібліятэкі была праведзена экскурсія і літаратурная гульня-падарожжа “Сказки – наши друзья”, прысвечаная Году кнігі.

*МУЗЕЙНАЯ СПРАВА*

**4–5 мая** ў Віцебскім абласным краязнаўчым музеі, музеі Марка Шагала і Віцебскім АМЦНТ прайшла навукова-практычная канферэнцыя “Мастацтва прымітыву і яго формы ў сучаснай культуры” ў межах IV Нацыянальнай выставы наіўнага мастацтва “Insita-2012”.

*Віцебскі АМЦНТ*

Актывісты маладзёжнага сацыяльна-культурнага аб’яднання “Русь молодая” **12 мая** сустрэліся ў Віцебскім абласным музеі імя Героя Савецкага Саюза М. П. Шмырова з ветэранамі абласнога цэнтра. Грамадскае аб’яднанне з’яўляецца суарганізатарам ад Рэспублікі Беларусь Міжнароднай акцыі “Георгиевская лента – дорогами памяти”. Маладыя людзі не проста наведваюць беларускія гарады: з сабой яны вязуць вялікую георгіеўскую стужку



памерам 2 на 30 метраў, на якой ветэраны, а таксама актывісты маладзёжных арганізацый пакідаюць свае пасланні. **18 мая** стужка завяршыла свой маршрут па Беларусі, адправіўшыся ва Украіну і Малдову. **22 чэрвеня** яна будзе ганарова перададзена ў Маскву, у музей Узброеных Сіл Расійскай Федэрацыі.

*Віцебскі рабочы. – 2012. – 15 мая. – С. 5.*

**18 мая** абласны краязнаўчы музей запрасіў наведвальнікаў акунуцца ў атмасферу XIX стагоддзя, прысвяціўшы сваю “Ноч музеяў” 200-годдзю вайны 1812 года. Акрамя экспазіцыі артэфактаў вайны ў музеі працаваў салон прыгажосці, дзе можна было зрабіць прычоску “как у Наташи Ростовой”, або нанесці тэматычную татуіроўку. У праграме было і пляценне з бісеру, свецкія забавы, шарады.

Вечар французскай паэзіі эпохі рамантызму падаравалі гастям студэнты ВДУ імя П. М. Машэрава. Свабодных месцаў у зале амаль не было – ігралі “Эрнани” Віктора Гюго на мове арыгінала. Завяршылася “Ноч музеяў” шэсцем са свечкамі ў скверы герояў вайны 1812 года.

У той жа вечар у музеі М. П. Шмырова адкрылася выстава матацыклаў мотаклуба “Псы дорог”. Клуб гістарычнай рэканструкцыі “Талион” у сваіх выступленнях імітаваў сярэдневяковыя паядынкі, рыцарскія забавы, а клуб ваенна-гістарычнай рэканструкцыі “Товарищи по оружию” дэманстраваў асаблівасці быту і ўніформу часоў другой сусветнай вайны.

Яшчэ адной святочнай пляцоўкай стаў Цэнтр сучаснага мастацтва. У выставачнай зале была адкрыта выстава студэнцкіх работ, а ў дадатак да традыцыйнай святочнай экспазіцыі ў гэты дзень прайшоў арт-батл “Эверласт” дзвюх каманд – мастацка-графічнага факультэта ВДУ імя П. М. Машэрава і кафедры дызайна ВДТУ. З першымі зоркамі на небе каля гістарычнага будынка Віцебскага Народнага мастацкага вучылішча па вуліцы Праўды, 5а